МІНІСТР ІНФАРМАЦЫІ Міхаіл НАДГАЙНЫ: "БЕЛАРУСКАЙ ПРЭСЕ НЕ ПАЗБЕГНУЦЬ КАНКУРЭНЦЫІ" 2 стар.

У ПАРЛАМЕНЦЕ
ДЭПУТАТАЎ ЗАПРАСІЛІ ВА ЎСТАНОВЫ КУЛЬТУРЫ 3 стар.

ДЫПКУР'ЕР
НАДРЫХТАВАЛА СПРАВАЗДАЧА АБ ЭКСПАРЦЕ ЎЗБРАЕННЯЎ 3 стар.

Вера КАВАЛЕРАВА — АКТРЫСА З "ПЯЛЁНАК" 4 стар.

НАВІНЫ З АРХІВА
РАЗГРОМ МАСОНСТВА Ў МІНСКУ 5 стар.

ВЕСТКІ З СУПОЛАК
"МАЛАНКА" — У СІБІРЫ НЕ ІНШАЗЕМКА 6 стар.

ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА
АПОВЕСЦЬ Алеся НАВАРЫЧА "ПАНІ З САБАЧКАМ..." (працяг) 7 стар.

СЛУХАЙ СВАЁ
НОВЫЯ ХІТЫ СТАРОГА АЛЬБОМА 8 стар.

КРЫЖАВАНКА АД Любові ЮНАВАЙ. 8 стар.

АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ

Голас Радзімы

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі

Выдаецца з 6 красавіка 1955 года

27 лістапада 2002 года, № 48 (2814) Цана 150 рублёў E-mail:golas_radzimy@tut.by

хроніка жыцця

ПРАДСТАЎНІК БЕЛАРУСІ ПРЫНЯЎ УДЗЕЛ У САМІЦЕ НАТО

Прадстаўляць Рэспубліку Беларусь на саміце Савета еўраатлантычнага партнёрства ў Празе даручана Пастаяннаму прадстаўніку нашай краіны пры НАТО Сяргею Мартынаву. Рашэнне аб гэтым было прынята беларускім урадам.

Сяргей Мартынаў выступіў на пленарным пасяджэнні Савета з заявай ад імя Прэзідэнта Беларусі.

АДНАЎЛЕННЕ МАГІЛЁВА

Улады абласнога цэнтра збіраюцца аднавіць гістарычную частку горада.

Будаўнічыя работы будуць праведзены на вуліцах Першамайскай, Ленінскай, Піянерскай, Лазарэнкі і на Савецкай плошчы. Тут мяркуецца выбрукаваць тратуары, адрамантаваць і перафарбаваць у розныя колеры ўсе будынкі. Пры гэтым плануецца вуліцу Ленінскую зрабіць цалкам пешаходнай. Праграма рэстаўрацыі гістарычнага цэнтра разлічана на 10 гадоў.

НУРЫ НУМАНАЎ З ДЗЕРБІНА

Фота БелТА.

Занесены 20 гадоў таму на беларускую зямлю жыццёвымі абставінамі ўзбек Нуры Нуманаў так і "прыжыўся" тут.

Працуе вартаўніком у калгасе імя Горкага Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці і сумяшчае яшчэ адзін занятак — збірае малако з прыватных падвор'яў. Тут жа ў вёсцы Дзербін у яго сям'я, дзеці.

НА ЗДЫМКУ: беларускі ўзбек Нуры НУМАНАЎ — зборшчык малака ў вёсцы Дзербін.

УМАЦАВАННЕ МЯЖЫ

Адбылася ўрачыстая перадача Гомельскаму пагранатраду тэхнікі і абсталявання, закупленых у рамках сумеснага праекта ААН з Еўрапейскай камісіяй "Умацаванне кантролю на беларуска-ўкраінскай мяжы".

Беларускім вартавым граніцы ўручаны тры мабільныя пагранзаставы, аўтамабілі аператыўнага рэагавання, спецабсталяванне для праверкі дакументаў і грузаў, перасоўныя пункты для адпачынку пагранічнікаў.

У цырымоніі перадачы абсталявання і тэхнікі прынялі ўдзел кіраўнік прадстаўніцтва ААН у нашай краіне Ніл Бунэ, кіраўнік офіса "ТАСІС" беларускага прадстаўніцтва Еўрапейскай камісіі Рауль дэ Люзенбергер, старшыня Дзяржаўнага камітэта пагранвойскаў Рэспублікі Беларусь генерал-лейтэнант Аляксандр Паўлоўскі і іншыя афіцыйныя асобы.

Умацаванне дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь, якая павінна стаць надзейнай заслонай на шляху ўзрастаючай трансгранічнай злачыннасці, з'яўляецца актуальным пытаннем не толькі для нашай краіны, а і для міжнароднай супольнасці.

РОДНЫЯ АПАЗНАЛІ ЎКРАІНСКАГА ЖУРНАЛІСТА

Экспертыза пацвердзіла, што пад Маладзечнам знойдзены труп дырэктара інфармагенцтва "Украінскія навіны" Міхаіла Каламійца.

Маці і блізкая сяброўка дырэктара інфармацыйнага агенцтва "Украінскія навіны" Міхаіла Каламійца апазналі яго.

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязей МЗС карэспандэнту БелТА, апазнанне трупа адбылося 20 лістапада. Супрацоўнікі беларускіх праваахоўных органаў, якія знайшлі цела Каламійца ў лесе каля Маладзечна, не выявілі прымет гвалтоўнай смерці. Яго маці мяркуе, што сын мог скончыць жыццё самагубствам, аб чым ён выказваўся ў тэлефонных размовах з ёю. Праваахоўныя органы Украіны збіраюцца правесці ўласнае расследаванне гэтага выпадку.

ПАДАРУНАК ЗЕМЛЯКАМ

Ураджэнец вёскі Кумпяны Астравецкага раёна Мар'ян Бароўка, які цяпер жыве ў ЗША, перадаў у раённую цэнтральную бальніцу прыборы інтэнсіўнай тэрапіі для аддзялення рэанімацыі, апарат для даследавання цяжарных жанчын, а таксама партыю аднаразовых інструментаў і матэрыялаў.

Гэта не першая гуманітарная дапамога, з якой прыязджае ў госці да землякоў былы жыхар раёна. У мінулы раз Мар'ян Бароўка прывёз абсталяванне для аснашчэння некалькіх медыцынскіх кабінетаў бальніцы. Ад усяго персанала падзякаваў госцю за дабрачынную акцыю намеснік галоўнага ўрача Астравецкага тэрытарыяльнага медыцынскага аб'яднання Аляксандр Драйчук.

Падрыхтавала Таццяна КУВАРЫНА.

фотафакт

Фота БелТА.

ВЫРАТАВАЛЬНІКІ БУСЛОЎ

Чорнага бусла з прастрэленым крылом знайшлі на ўскрайку лесу бабуля з унукам – жыхары Гомельскага раёна.

Спачатку птушку змясцілі ў гарадской СШ № 10, а цяпер яна знаходзіцца ў спецыяльным гадавальніку Вышэйшага камандна-інжынернага вучылішча Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, дзе ў яе ёсць "сябры па няшчасці", якія не змаглі паляцець у цёплыя краі, — два белыя буслы. Курсанты вучылішча з любоўю даглядаюць гадаванцаў, сярод якіх дзікія качкі і лебедзь.

НА ЗДЫМКУ: курсанты Міхаіл СІМАНАЎ, Аляксандр ГАНЧЫЦ і Анатоль ТАНКАНОГ з буслам.

дабрачыннасць

ДОРАЦЬ НАДЗЕЮ І ДАМЫ ДЗЕЦЯМ

"Надзея і дамы – дзецям" – так называецца праграма, якую ажыццяўляюць у Беларусі дабрачынная арганізацыя Вялікабрытаніі з такой назвай і Беларускі дзіцячы фонд.

На працягу двух гадоў у ходзе рэалізацыі гэтай праграмы 12 беларускіх сем'яў, якія ўзялі на выхаванне дзяцей-сірот, справілі наваселле ў добраўпарадкаваных катэджах з мэбляй, бытавой тэхнікай і кухоннымі прыналежнасцямі. Прычым для максімальнай абароны інтарэсаў дзяцей-сірот, узятых у сем'і на выхаванне, жылыя дамы на працягу 15 гадоў застаюцца ва ўласнасці Беларускага дзіцячага фонду. І толькі пасля гэтага тэрміну будуць безвыплатна перададзены ва ўласнасць сем'яў.

Вольга МОХАВА. Мінск-Навіны".

ПАДПІСКА-2003

Шаноўныя чытачы «Голасу Радзімы»! Каб наша сувязь не спынілася, раім паклапаціцца аб падпісцы. Нагадваем, што «ГР» уключаны ў падпісныя каталогі Беларусі, Літвы, Украіны, Казахстана, Таджыкістана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі.

У іншых краінах лепш аплаціць атрыманне штотыднёвіка чэкам, даслаўшы яго ў рэдакцыю. Кошт гадавога камплекта для краін Еўропы — 50, астатніх — 60 долараў ЗША.

БУДЗЕМ РАЗАМ!

спорт

НАСТОЛЬНЫ ТЭНІС. На сёлетнім першынстве Еўралігі беларускія майстры настольнага тэнісу ўпершыню ўвайшлі ў тройку лепшых каманд кантынента і ў наступным годзе разыграюць прызавыя месцы ў кампаніі са шведамі і югаславамі.

ФУТБОЛ. 1 снежня плануецца завяршыць першы этап уводу крытага футбольнага манежа ў Мінску. Аналагаў такому збудаванню на постсавецкай прасторы няма. Дастаткова адзначыць, што даўжыня манежа — 120 метраў, максімальная вышыня — 21, а кожная арачная апора мае пралёт 100 метраў. У рэалізацыі праекта занята звыш 20 арганізацый, у тым ліку і замежныя — са Славеніі і Канады.

ХАКЕЙ. У рамках падрыхтоўкі да снежаньскага сусветнага форуму ў Канадзе маладзёжная зборная Беларусі выйграла ў дамашнім турніры.

Міхаіл МАЗАКОЎ.

знак якасці

Фота БелТА.

ГОМЕЛЬСКІЯ БУДМАТЭРЫЯЛЫ: ШЛЯХ НА ЕЎРАПЕЙСКІ РЫНАК

Прадпрыемству ААТ "Гомельбудматэрыялы" ўручаны сертыфікат еўрапейскай сістэмы якасці ІСО-9000 па версіі 2001 года. Уладальнікаў такіх сертыфікатаў у Беларусі няшмат.

На Гомельшчыне гэта першае будаўнічае прадпрыемства. Атэстацыя на еўрапейскі сертыфікат стала вынікам двухгадовай работы па тэхнічнай рэканструкцыі з мэтай укаранення сучасных тэхналогій. І як адзін з вынікаў — перамога на нядаўнім рэспубліканскім конкурсе "Лепшая прадукцыя года" ў намінацыі "Цеплаізаляцыйныя матэрыялы".

Асноўная прадукцыя ААТ "Гомельбудматэрыялы" — пенагазасілікатныя блокі і перагародкі, а таксама цеплаізаляцыйныя вырабы на аснове базальту. Яны пастаўляюцца ў Маскву, Санкт-Пецярбург, у паўночна-заходнія рэгіёны Расіі, на рынак Украіны. Наяўнасць еўрапейскага сертыфікату ІСО-9000 па версіі 2001 года адкрывае шляхі і на еўрапейскі рынак.

НА ЗДЫМКУ: дырэктар Гомельскага цэнтра стандартызацыі і метралогіі Галіна ШАЛАЕВА ўручыла сертыфікат якасці генеральнаму дырэктару ААТ "Гомельбудматэрыялы" Алегу СЕЙБЕЛЮ.

падрабязнасці

Генадзь НЯВЫГЛАС:

«ПОЛЬСКІ БОК ПРЫНЯЎ БЕСПРЭЦЭДЭНТНАЕ РАШЭННЕ...»

Беларускае кіраўніцтва лічыць беспрэцэдэнтным рашэнне польскага боку аб недапушчэнні на сваю тэрыторыю каля 140 расійскіх грамадзян каўказскага паходжання, якія накіроўваюцца ў розныя краіны Еўропы. З афіцыйнай заявай па гэтым пытанні выступіў па даручэнні Прэзідэнта Беларусі Дзяржсакратар Савета Бяспекі Генадзь Нявыглас.

Як паведаміў Г.Нявыглас, беларускі бок са спазненнем атрымаў інфармацыю, што Польшча не збіраецца прапускаць праз свае межы чэчэнцаў. У дакуменце адзначаецца, што, згодна з рашэннем галоўнага каменданта пагранічнай варты, "грамадзянам Расіі чэчэнскай нацыянальнасці ўезд у Польшчу будзе забаронены". У якасці матывіроўкі прыводзіцца спасылка на закон аб замежных грамадзянах, дзе ўказваецца, што забарона на ўезд на тэрыторыю Польшчы можа быць вынесена ў тым выпадку, калі іх знаходжанне там непажаданае з-за пагрозы бяспецы, у інтарэсах абароны дзяржавы або для забеспячэння абароны насельніцтва і грамадскага парадку. Такім чынам, заявіў Г.Нявыглас, "прынята беспрэцэдэнтнае рашэнне, калі на тэрыторыю дзяржавы забаронены ўезд цэлай катэгорыі грамадзян Расіі, прычым па нацыянальнай прыкмеце". Падобныя дзеянні беларускі бок лічыць несумяшчальнымі з дэмакратычнымі прынцыпамі і міжнароднымі правіламі перасячэння дзяржаўных межаў, паколькі ўказаная катэгорыя грамадзян мае ўсе неабходныя для гэтага дакументы. Ва ўсякім разе, прэтэнзій да іх расійскія і беларускія ўлады не маюць.

Паводле слоў Г. Нявыгласа, 70 працэнтаў чэчэнцаў — жанчыны і дзеці. Таму А.Лукашэнка даручыў звярнуць увагу расійскага пасольства ў Беларусі і расійскага консульства ў Брэсце на неабходнасць тэрміновага вырашэння ўзнікшай праблемы. Прэзідэнт Беларусі распарадзіўся таксама прыняць усе меры па лакалізацыі сітуацыі.

абітурыент-2003

ВЫДАТНАЯ СЯМЁРКА

Сотні мінчан прынялі ўдзел у Дні адкрытых дзвярэй у Ваеннай акадэміі. Прычым сярод тых, хто прыйшоў сюды, каб узважыць усе "за" і "супраць" у выбары будучай прафесіі, было нямала дзяўчат.

Прафесія ваеннага карыстаецца сярод беларускай моладзі папулярнасцю: конкурс у Беларускай ваеннай акадэміі з кожным годам павялічваецца. А сёлетні навучальны год для яе унікальны яшчэ і тым, што ўпершыню на факультэты сувязі і аўтаматызаваных сістэм кіравання залічылі 7 дзяўчат. Як сказаў кіраўнік ВНУ, будучыя афіцэры ў спадніцах выдатна спраўляюцца з суровымі вайсковымі абавязкамі. Так што дзяўчат, відаць, дапусцяць да ўступных экзаменаў у Ваенную акадэмію і ў наступным годзе.

Кацярына СКАМЕЙКА.

"Мінск-Навіны".

ад першай асобы

Міхаіл ПАДГАЙНЫ: "БЕЛАРУСКАЙ ПРЭСЕ НЕ ПАЗБЕГНУЦЬ КАНКУРЭНЦЫІ..."

Нядаўна ў Берліне прайшоў чацвёрты Кангрэс рускай прэсы, у якім прымала ўдзел прадстаўнічая дэлегацыя нашай краіны на чале з віцэ-прэм'ерам Беларусі Уладзімірам Дражыным. У ліку прадстаўнікоў Беларусі знаходзіўся і міністр інфармацыі Міхаіл Падгайны, які сёння выказвае сваё меркаванне наконт стану беларускай прэсы.

— Кангрэс рускай прэсы быў утвораны пяць гадоў таму ў Нью-Йорку. Напачатку гэта арганізацыя аб'ядноўвала рускамоўныя газеты Захаду. А з пазамінулага года яна пачала прыцягваць да ўдзелу ў мерапрыемствах усіх, хто піша на рускай мове і выдае газеты і часопісы для людзей, якія этнічна адчуваюць сябе рускімі ва ўсіх краінах свету, у тым ліку, і на постсавецкай прасторы. Таму апошнія два кангрэсы праходзілі ў Маскве і ў Кіеве. Зараз вялікае свята рускамоўнай прэсы адбылося ў Германіі.

У Берліне, у Рускім доме, сабраліся прадстаўнікі больш чым 30 краін. Упершыню ў кангрэсе брала ўдзел прадстаўнічая беларуская дэлегацыя.

— Што на кангрэсе прадэманстравалі беларусы? Якія былі прадстаўлены СМІ?

— Адразу меркавалася, што асноўныя пазакангрэсавыя мерапрыемствы будуць звязаны з Беларуссю. У першы дзень адбыўся афіцыйны прыём ад імя беларускай дэлегацыі. На другі — адкрылася выстава "Прэса ў Беларусі". Мы прадставілі на ёй два нашы галоўныя інфармацыйныя агенцтвы — БелТА и БелаПАН, а таксама чатыры асноўныя тэлевізійныя кампаніі: БТ-1, АНТ, СТБ і 8-мы канал. І прадэманстравалі шырокі спектр газет, у тым ліку і беларускамоўныя выданні: "Голас Радзімы", "Звязду", "Культуру". Мне спачатку на прэс-канферэнцыі, а потым, калі бралі інтэрв'ю асобна, задавалі пытанне наконт стану рускамоўнай прэсы ў Беларусі. Я адказаў: тут у нас няма праблем. Болей за тое, паміж Беларуссю і Расіяй існуюць двухбаковыя дамоўленасці, якія здымаюць усе абмежаванні па распаўсюджанні беларускай прэсы ў Расіі, рускамоўнай — у Беларусі. У нас існуе іншая праблема: як сёння ў Беларусі захаваць беларускамоўную прэсу.

— Ці прайшлі ў час кангрэса перамовы, якія ўяўляюць для вас цікавасць?

— Двухбаковыя перамовы адбыліся ў нас з прадстаўнікамі практычна ўсіх краін-удзельніц, у першую чаргу, ЗША, Ізраіля, Англіі, Германіі. Размова ішла пра распаўсюджванне нашай інфармацыі і ўзаемны абмен інфармацыяй. Актыўна працаваў генеральны дырэктар БелТА Якаў Аляксейчык, прадстаўляючы магчымасці агенцтва. Кіраўнік БелаПАНа Алесь Ліпай таксама дэманстраваў магчымасці свайго агенцтва, мажлівасць атрымання разнастайнай цікавай інфармацыі з Беларусі. Гэта зацікавіла шматлікія замежныя рускамоўныя выданні. Прайшлі перамовы наконт узаемнага абмену інфармацыяй і ўзаемных кантактаў.

— Цікава, як на фоне замежных выданняў выглядала наша прэса?

— Мы годна выглядаем на еўрапейскім узроўні. Беларусь уваходзіць у дзесятку краін свету па якасці газетна-часопіснай паліграфіі, кніжнага друку.

— Калі і дзе пройдзе наступны Кангрэс рускай прэсы?

— Многія краіны прапанавалі правесці наступны кангрэс у сябе. Сярод іх былі Грэцыя, Італія, Балгарыя. Але рашэнне, дзе будзе праходзіць гэтае мерапрыемства, прыме асобна новае кіраўніцтва, якое будзе абрана. Беларусь пакуль не выносіла такой прапановы.

— Якой вам бачыцца перспектыва супрацоўніцтва з сусветнай прэсай?

— Супрацоўніцтва з сусветнай прэсай, у тым ліку і з рускамоўнай, у любым выпадку проста неабходнае.

— Якая дынаміка развіцця беларускага рынку СМІ, друкаваных масавых выданняў?

— Яна стабільная. Колькасць газет і часопісаў па найменнях і накладах практычна стабільная на працягу двух-трох гадоў. Радуе з'яўленне новых цікавых выданняў. Сёння пачынае больш актыўна развівацца рэгіянальны, каляровы друк. Новая сітуацыя на рынку СМІ прымушае думаць, як ісці далей, што рабіць, шукаць новыя шляхі.

— Прагнозы аналітыкаў наконт канкурэнтаздольнасці на беларускім рынку беларускамоўнай прэсы не вельмі аптымістычныя, бо беларуская мова ў сферы ўжытку саступае пазіцыі рускай.

— Чаму не аптымістычныя? Пісаць трэба цікава. У сямідзесятыя гады я шукаў па ўсім Мінску кнігі Уладзіміра Караткевіча на беларускай мове. Калі чытаў яго творы, яны мяне захапілі. Хто зараз на такім узроўні ў нас піша? Калі знойдзецца такі аўтар, дык мы яго творы выдадзім мільённым накладам.

І яшчэ наконт ужывання моў. Мой сын, напрыклад, добра валодае беларускай, рускай і англійскай мовамі. І ён не выключэнне. Давайце рыхтаваць у нашай краіне больш высокаадукаваных людзей. Давайце ўсе разам на гэта працаваць.

Новая сітуацыя на беларускім рынку СМІ прымушае думаць, як ісці далей, як вытрымаць канкурэнцыю на сусветным рынку інфармацыі.

Гутарыла Наталля БОЎШ.

тысячны пасажыр

Пасля доўгага прастою ў дзевяностых гадах зноў аднавіліся палёты на мясцовых авіялініях.

У Віцебскім аэрапорце напярэдадні Дня грамадзянскай авіяцыі адбылося ўшанаванне тысячнага пасажыра. Ім стаў дырэктар навукова-вытворчага цэнтра "Еўрапрыбор" Сяргей Масалаў, які ляцеў рэйсам "Віцебск—Мінск" (на здымку).

Фота Аляксандра ХІТРОВА, БелТА.

экстрым

ПАЛІГОН ДЛЯ ВЫРАТАВАЛЬНІКАЎ

Каля Барысава ствараецца Міжнародны цэнтр падрыхтоўкі выратавальнікаў.

Гэта месца занесена на карту выратавальнікаў многіх краін як аператыўна-тактычны палігон экстра-класа. Тут ужо ёсць і манцуюцца новыя унікальныя трэнажоры, папаўняецца набор вучэбных дапаможнікаў. Завяршаецца і будаўніцтва зручнага і прасторнага інтэрната для слухачоў цэнтра.

Дапамагае ствараць гэты цэнтр беларускім выратавальнікам Швейцарская канфедэрацыя, якая пералічыла 575 тысяч долараў для ажыццяўлення праекта. Праходзіць навучанне ў Міжнародным цэнтры падрыхтоўкі выратавальнікаў змогуць спецыялісты з краін блізкага і далёкага замежжа. Пры гэтым плата за вучобу кожнага замежнага курсанта складзе прыкладна 2,5 тысячы долараў ЗША. Калі ж спецыяліст з той ці іншай краіны не зможа заплаціць такую суму, усе выдаткі возьме на сябе швейцарскі бок.

Вікторыя КОЛЧЫНА.

«Мінск-Навіны».

у парламенце

ЗАПРАШАЕ ДОМ КУЛЬТУРЫ...

Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе правяла сумесна з Саветам дырэктараў ведамасных устаноў культуры выязное пасяджэнне ў Віцебску.

Удзельнікі пасяджэння.

Апошнім часам абвастрылася пытанне захавання ведамасных Дамоў культуры. Многія прадпрыемствы не ў стане ўтрымліваць іх і імкнуцца перадаць на баланс дзяржавы. Апошняя, зразумела, не можа ўзяць на сябе такі цяжар, бо большасць устаноў, ад якіх імкнуцца пазбавіцца, знаходзіцца ў дрэнным матэрыяльна-тэхнічным стане: 811 устаноў клубнага тыпу, па словах дэпутата **Наталлі Аўдзеевай**, патрабуюць капітальнага рамонту, 68 знаходзяцца ў аварыйным стане.

Па інфармацыі **Валерыя Гедройца**, намесніка міністра культуры РБ, усяго ў нашай краіне працуе 4 630 клубаў і Дамоў культуры, 8,1 працэнта з іх — ведамасныя. З 5166 працуючых бібліятэк прадпрыемствам, грамадскім аб'яднанням і прафсаюзным арганізацыям належыць 8,5 працэнта. Аднак ведамасныя ўстановы культуры абслугоўваюць у працэнтных адносінах значна большую частку насельніцтва. В.Гедройц падкрэсліў, што ўзровень творчых і мастацкіх калектываў ведамасных устаноў, а таксама іх колькасць значна перавышаюць тыя, што знаходзяцца ў структуры Міністэрства культуры. У цэлым жа ў нашай краіне ў самадзейнай творчасці занята 130 тысяч чалавек. Кажучы ж пра палітыку Міністэрства культуры ў дачыненні да ведамасных устаноў культуры, намеснік міністра падкрэсліў, што ацэньваюцца ўстановы культуры не па прынцыпу ўласнасці, а па якасці прапануемых паслуг.

Але "Закон аб бюджэце" ўсё ж размяжоўвае ведамасныя і дзяржаўныя ўстановы культуры. Гэта праяўляецца ў сістэме падаткаабкладання. Падатковыя зборы для недзяржаўных аб'ектаў культуры дасягаюць 60 працэнтаў ад прыбытку. Па словах саветніка намесніка старшыні Федэрацыі прафсаюзаў па пытаннях культуры Анатоля Сушы, сённяшняя сітуацыя з установамі культуры вельмі небяспечная. У 1991 годзе, які быў нялёгкім як для краіны ў цэлым, так і для культуры, у прыватнасці, на Беларусі закрылася 40 Дамоў культуры. Не хацелася б, каб падобнае паўтарылася. А.Суша падкрэсліў, што з 1999 года толькі дзяржаўныя ўстановы культуры не плацяць падатак на прыбытак і дабаўленую вартасць. Яшчэ адна сур'ёзная праблема: ведамасным установам культуры камунальныя паслугі абыходзяцца значна даражэй.

Новая рэдакцыя "Закона аб культуры", над якой зараз працуюць парламентарыі, не прадугледжвае класіфікацыю ўстаноў культуры па відах уласнасці. Гэта павінна стварыць роўныя ўмовы як для ведамасных, так і для дзяржаўных аб'ектаў культуры. Застаецца злабадзёным пытанне працэнтнай нормы фінансавання галіны, якая цяпер складае 3 працэнты ў дзяржбюджэце. Наталля Аўдзеева не выключае, што на Беларусі магчыма выкарыстаць расійскі вопыт, калі 2 працэнты сродкаў забяспечыць дзяржаўны і столькі ж мясцовы бюджэт.

Нават калі адбудуцца пэўныя змены ў заканадаўстве, застанецца шэраг праблем як у дзяржаўных, так і ведамасных устаноў культуры. І адны, і другія знаходзяцца ў нялёгкім становішчы. Да таго ж палітыка прадпрыемстваў, якім належаць вышэйназваныя ўстановы, такая: Дамам культуры трэба самім зарабляць грошы. Пры тым, што прадпрыемствам улады не рэкамендуюць пазбаўляцца ад сацыяльна значных аб'ектаў, многія кіраўнікі заяўляюць, што не ў стане іх утрымліваць.

Віцебскі палац культуры і тэхнікі чыгуначнікаў — прыклад выжывання ў няпростых умовах. Тут 26 аматарскіх аб'яднанняў, Музей гісторыі чыгуначнага транспарту. У будынку, што працуе з 1964 года, тры гады таму зрабілі капітальны рамонт. Цяпер мяняюць сістэму ацяплення і вентыляцыі, што абышлося прыблізна ў 102 мільёны рублёў. Віцебскаму аддзяленню Беларускай чыгункі неяк удаецца без затрымак фінансаваць палац. Але, на думку дырэктара культурна-дзелавога цэнтра "КІМ" **Дзмітрыя Бязбожнага**, што таксама ў Віцебску, прадпрыемствы, якія маюць установы культуры, плацяць за яе 2 разы. Першы — гэта падаткі, частка якіх ідзе і на гэту галіну. Другі — утрыманне ўласнага Дома культуры. Не заўсёды прыбытковасць можа павялічвацца шляхам павелічэння кошту паслуг. Асабліва гэта тычыцца Дамоў культуры інвалідаў і ветэранаў. **Анатоль Нікіцін**, намеснік старшыні цэнтральнага праўлення Беларускага таварыства глухіх, падкрэсліў: "У нашай краіне больш за 150 тысяч чалавек з парушэннямі слыху, з іх працуючых — 1,5 тысячы. Менавіта на іх сродкі і існуюць нашы Дамы культуры, утрыманне якіх з-за недасканаласці падатковага заканадаўства каштуе занадта дорага. Чамусьці мала хто задумваецца пра тое, што нашы ўстановы маюць пэўную спецыфіку. Мы не збіраем на свае мерапрыемствы такую колькасць людзей, як стадыёны. Таму цяжка казаць пра сапраўдныя магчымасці зарабляць грошы".

Фота Сяргея ДЗЕНІСЕНКІ.

Дэпутат парламента Наталля АЎДЗЕЕВА.

Тое ж і з Домам культуры ветэранаў, што ў Мінску. Нешта зарабляецца, дзякуючы арандатарам, што месцяцца ў будынку. Але адзін з іх — Нацыянальны цэнтр культур — павінен ДК больш за 1 мільён рублёў.

Намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама **Пётр Южык** прапанаваў не ўспрымаць сітуацыю як трагічную, а шукаць новыя шляхі для развіцця сферы культуры.

Алена СПАСЮК.

дыпкур'ер

АЛЯКСАНДР СЫЧОЎ ПРЫНЯЎ УДЗЕЛ У РАБОЦЕ 57-Й СЕСІІ ГЕНЕРАЛЬНАЙ АСАМБЛЕІ ААН

Намеснік міністра замежных спраў Аляксандр Сычоў, які адначасова з'яўляецца намеснікам кіраўніка ўрадавай дэлегацыі Беларусі на гэтай сесіі, прыняў удзел у абмеркаванні пункта 53 парадку дня "Умацаванне сістэмы ААН". У якасці асновы для дыскусіі па згаданым пытанні прадстаўлены даклад Генеральнага сакратара ААН, які мае назву "Умацаванне ААН: праграма далейшых пераўтварэнняў".

Дакумент прадстаўлены Генеральным сакратаром ААН у прадаўжэнне мерапрыемстваў па рэфармаванні ААН, якія былі ініцыяваны ім у 1997 годзе.

Мэта даклада — павысіць эфектыўнасць работы ААН для дасягнення задач, якія выкладзены ў Дэкларацыі тысячагоддзя, а таксама ў заключных дакументах найбуйнейшых канферэнцый і сустрэч на вышэйшым узроўні пад эгідай ААН у сацыяльна-эканамічнай сферы, перш за ўсё, Міжнароднай канферэнцыі па фінансаванні развіцця і Сусветнай сустрэчы на вышэйшым узроўні па ўстойлівым развіцці.

У згаданым кантэксце Генеральным сакратаром ААН сфармуляваны шэраг прапаноў у такіх галінах, як: 1) агульнае правядзенне праграмнай дзейнасці сістэмы ААН у адпаведнасці з прыярытэтамі, якія замацаваны ў дакументах вышэйназваных глабальных форумаў; 2) узмацненне ролі праваахоўнай праблематыкі ў рамках праграм развіцця, якія падтрымлівае ААН; 3) паляпшэнне абслугоўвання дзяржаў-членаў; 4) паляпшэнне каардынацыі паміж установамі сістэмы ААН на ўзроўні штаб-кватэр і на месцах; 5) выпрацоўка новых форм узаемадзеяння ААН з няўрадавымі арганізацыямі і прыватным сектарам; 6) аптымізацыя работы Дэпартамента грамадскай інфармацыі (ДГІ); 7) павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў Сакратарыята ААН.

Аляксандр Сычоў прыняў удзел у разглядзе беларускіх ініцыятыў, у тым ліку праектаў рэзалюцый "Забарона распрацоўкі і вытворчасці новых відаў зброі масавага знішчэння і новых сістэм гэтай зброі" і "Інтэграцыя краін з пераходнай эканомікай у сусветную гаспадарку". Паралельна з гэтым праводзіцца работа па актывізацыі супрацоўніцтва Беларусі з дзяржавамі-членамі ААН з мэтай супрацьдзеяння міжнароднай арганізаванай злачыннасці і тэрарызму. У адпаведнасці з зацверджанай пазіцыяй выказана падтрымка распрацоўкі і больш хуткага прыняцця ўсеабдымнай канвенцыі аб міжнародным тэрарызме і канвенцыі па барацьбе з актамі ядзернага тэрарызму.

ПАДРЫХТАВАНА СПРАВАЗДАЧА АБ ЭКСПАРЦЕ ЎЗБРАЕННЯЎ

Міністэрства замежных спраў падрыхтавала Нацыянальную справаздачу Рэспублікі Беларусь аб палітыцы экспартнага кантролю, экспарту ўзбраенняў і ваеннай тэхнікі ў 2001/2002 годзе.

Цяпер практычна ўсе дзяржавы Заходняй Еўропы, ЗША, Канады кожны год ажыццяўляюць падрыхтоўку аналагічных дакументаў у форме справаздачы ўрада перад парламентам.

МЗС накіравала даную справаздачу ў Камісію па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Яна ўключае ў сябе разгорнутую інфармацыю аб міжнародных рэжымах экспартнага кантролю, ролі Рэспублікі Беларусь у міжнародных намаганнях па прадухіленні распаўсюджвання зброі масавага знішчэння і сродкаў яе дастаўкі, а таксама звычайных узбраенняў і тэхналогій. Паказаны ўдзел Беларусі ў міжнародных дагаворах, дакументах і механізмах у гэтай сферы і выкананне рэспублікай сваіх абавязацельстваў у адпаведнасці з імі.

Варта адзначыць, што Беларусь першая на прасторы СНД падрыхтавала такі дакумент, што з'яўляецца адлюстраваннем імкнення краіны да павышэння транспарэнтнасці ў сферы экспартнага кантролю, гандлю ўзбраеннямі і ваеннай тэхнікай.

У далейшым МЗС Беларусі мае намер ажыццяўляць падрыхтоўку Нацыянальнай справаздачы па экспартным кантролі штогадова.

КАНСУЛЬТАЦЫІ МЗС БЕЛАРУСІ І ЕГІПТА

У Каіры адбыўся другі раунд кансультацый паміж знешнепалітычнымі ведамствамі Беларусі і Егіпта.

Былі абмеркаваны пытанні двухбаковага супрацоўніцтва, а таксама адбыўся абмен думкамі па найбольш вострых рэгіянальных і міжнародных праблемах, у тым ліку па пытаннях мірнага ўрэгулявання на Блізкім Усходзе, сітуацыі вакол Ірака, барацьбы з міжнародным тэрарызмам. У час перамоў егіпецкі бок выказаў гатоўнасць да актывізацыі ўсіх накірункаў двухбаковага ўзаемадзеяння і перш за ўсё ў гандлёва-эканамічнай сферы.

Прэс-служба МЗС.

анонс

УСЁ АБ АБАРОНЕ ПРАВОЎ

АСОБ, ЯКІЯ НАЛЕЖАЦЬ ДА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ СУПОЛЬНАСЦЕЙ БЕЛАРУСІ, МОЖНА ДАВЕДАЦЦА З НОВАГА ЗБОРНІКА ДАКУМЕНТАЎ

Выйшаў у свет зборнік дакументаў аб абароне правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей, аб нацыянальна-культурным развіцці нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь, падрыхтаваны Камітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, з мэтай пашырэння ведаў аб беларускім заканадаўстве ў азначаным тэматычным накірунку і больш трывалага прымянення прававых норм усімі, хто карыстаецца імі і хто абавязаны кантраляваць іх выкананне.

У першую частку зборніка ўвайшлі міжнародныя дагаворы, пагадненні, канвенцыі, пакты, пратаколы ААН, Савета Еўропы, ЮНЕСКА, СНД аб правах асоб, якія адносяцца да нацыянальных супольнасцей. Другую частку склалі нарматыўна-прававыя дакументы Рэспублікі Беларусь па азначанай тэме. У трэцяй частцы размешчаны даведкі аб органах дзяржаўнага кіравання, дыпламатычных прадстаўніцтвах, грамадскіх і рэлігійных аб'яднаннях, аб нацыянальным складзе насельніцтва Беларусі і інш.

Значная дапамога ў стварэнні і фінансавым забеспячэнні зборніка аказана Прадстаўніцтвам ААН у Рэспубліцы Беларусь і асабіста яго кіраўніком Нілам Буне, а таксама начальнікам Дэпартамента грамадскай інфармацыі ААН у Беларусі Віктарам Радзівіноўскім.

Адпаведныя галіновыя дакументы прадстаўлены Выканаўчым Камітэтам Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Міністэрствам замежных спраў, Нацыянальнай камісіяй Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА, Міністэрствам адукацыі, Міністэрствам статыстыкі і аналізу, Міністэрствам культуры, Міністэрствам інфармацыі, грамадскімі аб'яднаннямі.

Зборнік адрасаваны органам дзяржаўнага кіравання ўсіх узроўняў ад рэспубліканскіх да раённых, прадстаўнікам нацыянальных супольнасцей і іх грамадскім аб'яднанням, навукова-даследчым і навучальным установам, усім, хто цікавіцца пытаннямі міжнацыянальных адносін, забеспячэння правоў асоб, якія адносяцца да нацыянальных супольнасцей і справай захавання і ўмацавання раўнавагі ў беларускім грамадстве.

Плануецца падрыхтаваць пры падтрымцы Міжнароднага грамадскага аб'яднання "Валюнтас" электронную версію зборніка.

Ніна ХОДАР.

мяжа

ТАМОЖНЫ ПУНКТ "КАЗЛОВІЧЫ" — РЭКАНСТРУКЦЫЯ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Фота Рамана КАВЯКА, БелТА.

Рэканструкцыя пагранічнага пункта таможнага афармлення "Казловічы" для грузавых аўтамабіляў уступіла ў новую фазу. Разам з рамонтам будынкаў, уладкаваннем дадатковых каналаў для агляду аўтатранспарту і ўкладкай новага пакрыцця на ўсёй тэрыторыі будаўнікі прыступілі да рэалізацыі праекта другой чаргі пераходу, што прадугледжвае пашырэнне грузавога пераходу і будаўніцтва новага моста.

НА ЗДЫМКУ: стары мост стаў вельмі вузкім для праезду вялікагрузных аўтамабіляў.

этнашкола

Фота БелТА.

"ЗЕРНЕ, КІНУТАЕ Ў НІВУ"

Сенніцкая сярэдняя школа імя Янкі Купалы Мінскага раёна працуе па праграме этнашколы, канцэпцыя якой распрацавана ў 1991-1992 гадах дацэнтам Беларускага універсітэта культуры І.Сучковым.

Праграма навучання разам з агульнаадукацыйнымі прадметамі прадугледжвае ўдзел школьнікаў у фальклорных тэатрах, асваенне харэаграфічнага фальклору, выкананне народных песень, навучанне традыцыйнаму прыкладному мастацтву. Усе гэтыя накірункі паспяхова развіваюцца ў Сенніцкай этнашколе. Таму не выпадкова, што тут сустракаюцца навукоўцы і педагогі, каб абмяняцца думкамі, уражаннямі ад правядзення народных свят.

НА ЗДЫМКУ: удзельнікі навукова-практычнай канферэнцыі "Зерне, кінутае ў ніву".

шматгалоссе

ЛЮДСКІЯ ДУШЫ ЯДНАЮЦЬ ПЕСНІ

З мастацкага фестывалю "Гродна—Беласток"

Паміж нашым Прынямоннем і польскім Падляссем склалася добрая традыцыя праводзіць міжнародныя фестывалі "Мастацкія сустрэчы Гродна—Беласток". Ладзяцца яны штогод, па чарзе ў названых гарадах і прапагандуюць народнае мастацтва беларусаў Польшчы і палякаў Беларусі. Нядаўняе спатканне, праведзенае ў Гродне, прысвячалася 120-м угодкам Янкі Купалы і Якуба Коласа. І заканамерна, што фестываль пачаўся з песні "Мой родны кут" на словы хрэстаматыйнага коласаўскага верша. Цяжка перадаць, з якой любоўю выконваў гэты твор ансамбль "Прымакі" з Беластока. За што заслужана быў узнагароджаны авацыямі.

Гэтак жа цёпла і прыветна былі сустрэты гледачамі ўсе нумары польскіх суседзяў. Пра адвечныя клопаты чалавека і яго пачуцці хораша спявалі ансамблі "Цаглінкі" са Старога Ляўкова, "Рэчанька" з вёскі Козлікі, "Расспяваны Гарадок" з аднайменнага мястэчка, хары "Васілёчкі" (г.Бельск-Падляскі) і "Крыніца" з Беластока, іншыя гурты з Беласточчыны. Песні пра каханне, пра тое, як удавіца выпраўляла сына ў салдаты, пра вярбу і дуб, што аберагаюць чалавечую асобу, пра родную зямельку не толькі зачароўвалі слухачоў, а і клікалі іх да роздуму, асэнсавання пачутага. Не абышлося і без уласцівых нашым народам твораў жартоўнага жанру. Напрыклад, ансамбль "Хлопцы-рыбалоўцы" з вёскі Рыбалы пацешыў прысутных песняй, змест якой выказаны ў такіх словах: "А я хлопец добры, я не валацуга, Дзе дзеўку пачую, там і заначую".

Змястоўна і бліскуча выступілі таксама мастацкія калектывы, якія прадстаўлялі польскае насельніцтва Гродзеншчыны. У першую чаргу варта назваць фальклорныя ансамблі "Матчына пёсэнка" з вёскі Танявічы Шчучынскага раёна і "Зараніца" Радунскага ГДК (Воранаўскі раён). Яны вызначыліся высокім узроўнем выканання польскіх народных песень і сваім убраннем. Як сапраўдныя прафесіяналы, выступілі спевакі і музыкі ўзорнага хору "Камерата" і народнага камернага аркестра "Арфеон" са Слоніма. У іх выкананні прагучалі знакаміты паланез М.Агінскага "Развітанне з Радзімай" і "Пшонсічка" С.Манюшкі. Парадавалі сваім майстэрствам ансамблі "Ютшэнка" (Ваўкавыск), "Гродзенскія словікі", "Крэсавяцы" (Ліда), "Хабры" (Гродна), хары "Івянка" (Іўе), "Промень" (Шчучын), "Глос з-над Нёмна" (Гродна).

Змест выступленняў мастацкіх калектываў беларусаў Польшчы і палякаў Беларусі пранізвала любоў да сваёй гістарычнай радзімы і да зямлі, дзе ім выпала жыць. А яшчэ была прадэманстравана пераемнасць пакаленняў. Што засведчылі на сцэне юнацкі хор "Каласкі" з Беластока і дзіцячы ансамбль "Анжэліка" з Ліды, якія прымаюць песенную эстафету ў сваіх бацькоў.

Дзесяты па ліку мастацкі фестываль "Гродна—Беласток" паслужыў далейшаму збліжэнню і сяброўству людзей двух памежных рэгіёнаў Польшчы і Беларусі. Фестываль стаў адначасова і своеасаблівай справаздачай працуючых у гэтых краінах нацыянальных суполак, пра што гаварылі пры адкрыцці свята старшыня Беларускага грамадскага культурнага таварыства ў Беластоку Ян Сычэўскі і намеснік старшыні Саюза палякаў Беларусі Юзаф Пажэцкі. А закончылася сустрэча выкананнем песень "Пенкна наша Польска цала" ("Прыгожая ўся наша Польшча") і "Люблю наш край" на словы Канстанцыі Буйло. Іх спявалі ўсе ўдзельнікі фестывалю.

І напрыканцы крыху асабістага. Акрамя вялікай асалоды ад канцэрта, фестываль падарыў мне радасць сустрэчы з даўнім сябрам — журналістам з Беластока шаноўным Міхасём Хмялеўскім, колішнім старшынёй праўлення Беларускага грамадскага культурнага таварыства.

Алесь ЖАЛКОЎСКІ.

аўтограф

ВЕРА КАВАЛЕРАВА — АКТРЫСА З «ПЯЛЁНАК»

Лёс адпачатку спрыяў артыстцы Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача, заслужанай артыстцы Рэспублікі Беларусь Веры Кавалеравай. З самага маленства яна марыла стаць актрысай і ўжо ў дзіцячыя гады іграла нароўні з дарослымі майстрамі сцэны. Пра такіх, як яна, кажуць: нарадзілася пад шчаслівай зоркай. Сапраўды, творчы шлях Веры Кавалеравай пасыпаны ружамі. Яна лёгка і натуральна пачувае сябе ў сваёй прафесіі. Акцёрам трэба нарадзіцца, лічыць артыстка. Таму што гэта лад існавання.

Нехта нават казаў, што гэта не прафесія, гэта дыягназ. Людзі, якія доўга ідуць да акцёрства, напрыклад, Інакенцій Смактуноўскі, не адразу здагадваюцца пра сваё прадвызначэнне, але ж рана ці позна робяцца акцёрамі. Чалавек проста не здольны інакш існаваць, як у тэатры.

— Вы, напэўна, ужо ў дзяцінстве ведалі, што станеце актрысай?

— Мне падаецца, што я, як толькі нарадзілася, ужо іграла . Сама з сабой, потым у двары з сябрамі, стварала цэлыя спектаклі, дзе мне было вельмі цікава ўдзельнічаць. Натуральна, што ў ва ўсім гэтым павінен быў быць завадатар, каб прыдумваць гісторыі і іх увасабляць. Я была ў нашым двары і рэжысёрам, і актрысай.

— І пасля школы вы, вядома, вырашылі працягваць сваю прафесійную адукацыю?

— Не, у мяне ўсё было не так, не традыцыйна. Калі я пайшла ў першы клас, то паралельна пачала займацца на тэлебачанні ў дзіцячай студыі "Тэатр", дзе выкладала Клаўдзія Казакова — цудоўная актрыса школы Маскоўскага мастацкага тэатра. Дзесяць гадоў я там вучылася і адначасова працавала на тэлебачанні. БТ рыхтавала такім чынам дзяцей для ўдзелу ў розных перадачах, спектаклях. Потым мяне адразу запрасілі ў наш тэатр. А вучылася я ўжо пазней, калі стала вядучай актрысай тэатра.

— Колькі ролей вы выканалі, у колькіх спектаклях удзельнічалі?

— Я выканала болей за сто ролей. Але колькі "болей" — цяжка падлічыць.

— Да вас у тэатр прыходзяць у асноўным дзеці. Гэта вельмі тонкі і чуллівы, патрабавальны глядач. Напэўна, няпроста дайсці да яго сэрца і розуму?

— Глядач ТЮГа — ад 2-х да 72 гадоў. Мы заўсёды іграли п'есы не толькі для юных, але і для дарослых. Быў, праўда, нейкі перыяд, калі мы раптоўна перасталі іграць для дарослых, што было няправільна. Колькі існуе наш тэатр (а яму сорак пяць гадоў), заўсёды быў рэпертуар і для дзяцей, і для дарослых. Вучні старшых класаў — гэта тыя ж дарослыя. А вось падача матэрыялу ў нас асаблівая. Заўсёды лічыцца, што ў тэатры павінна існаваць чацвёртая сцяна. Аднак, калі мы пабудуем гэтую чацвёртую сцяну, лічыце, што гледача мы згубілі. У нас гэтай сцяны няма, яна ў нас вельмі празрыстая. Мы павінны чуць дыханне залы. Абавязкова павінна існаваць зваротная сувязь.Таму людзі, якія раней наведвалі з дзецьмі дарослыя тэатры, трапляючы ў ТЮГ, казалі, што тут усё зусім інакш, што дзіця проста заражаецца дзеяй. Так, у нас тэатр асобы, мы працуем інакш, мы прафесіяналы ў сваёй справе.

Чаму артысты ТЮГа не старэюць? Таму што мы заўсёды з нашымі юнымі гледачамі.

— Быў час, калі артысты перажывалі, што глядач менш пачаў хадзіць на спектаклі. А як зараз?

— Я мяркую, што такі час прайшоў. Але мы ніколі не пакутавалі ад недахопу гледача. Нават дарослыя тэатры ў той перыяд "выязджалі" на дзецях, таму што дзеці заўсёды ходзяць у тэатр, ва ўсе часы. І не таму, што ім надта хочацца, а таму што педагогі водзяць у тэатр, бацькі таксама імкнуцца далучыць дзяцей да культуры, мастацтва. Наш тэатр самы танны. Білеты сюды каштуюць танней за білеты ў кінатэатр, яны нават таннейшыя за марожанае. Наш тэатр разлічаны на тое, каб дзіця любога сацыяльнага слоя магло прыйсці ў наш тэатр.

— Колькі ў вас звычайна бывае спектакляў за дзень?

— Два-тры ранішнія. І вячэрнія.

— І як вы ўсё паспяваеце?

— Паспяваем. Нягледзячы на тое, што мы самы бедны тэатр. Нашы акцёры атрымліваюць зусім невялікія аклады. Хаця, здавалася б, усе ведаюць, што для дзяцей іграць цяжэй, чым для дарослых. Быў пэўны час, калі абмяркоўвалася гэтае пытанне і быў намер прыраўнаваць ТЮГ да асобага віду мастацтва і аплачваць працу нашых артыстаў як працу артыстаў цырка, балета.

— А як вашы артысты адчуваюць сябе ў гэтых складаных эканамічных умовах?

— Круцімся. Зарабляе кожны, дзе можа. Я, напрыклад, працую яшчэ ў маладзечанскім драматычным тэатры, на тэлебачанні, у "Калыханцы". Для душы працую, непастаянна, у тэатры "На балконе" Белдзяржуніверсітэта як педагог па майстэрству. Мы там паставілі спектакль "Дом Бернарды Альбы", дзе я выконваю ролю Бернарды Альбы.

— Над якімі новымі ролямі працуеце цяпер?

— Па-першае, як травесці я павінна заканчваць сваю дзейнасць, тым не менш я іграю вельмі актыўна. Я сябе шукаю ў іншым амплуа. Зараз пераходжу ў новую ўзроставую катэгорыю. У мяне ўжо ёсць такія ролі, але я пакуль існую і ў адной, і ў другой іпастасі. Зараз працуем з рэжысёрам Наталляй Башавай над спектаклем "Маленькі збраяносец". Ён будзе інакш называцца — "Рыцар ордэна сланечнікаў". Там я іграю фрэйліну. З Наталляй Башавай мы працуем над спектаклем "Восем закаханых жанчын", дзе заняты два саставы жанчын. Уяўляеце, шаснаццаць жанчын-актрыс будзе адразу занята ў спектаклі, які пакажам на малой сцэне. Аднаўляем з нашым галоўным рэжысёрам Андрэем Андросікам вадэвіль "Чаму ж не пець, чаму ж не гудзець?" паводле твораў Янкі Купалы і Міхася Чарота. Быў у нас даўно такі спектакль, які карыстаўся вялікім поспехам. Зараз спрабуем аднавіць яго з маладымі выканаўцамі. Я лічу, што ён не страціў сваёй актуальнасці, бо тут цудоўная беларуская драматургія.

— Вы працуеце толькі на беларускай мове?

— Так. У нас адзіны ў краіне тэатр юнага гледача. Хаця на малой сцэне магчымы розныя эксперыменты.

— Такім чынам, вы несяце культуру мовы і беларускае мастацтва ад самага пачатку свайго існавання і да сённяшняга дня...

— І не будзе аніякіх змен. Мы працуем і будзем працаваць на асноўнай сцэне на прыгожай беларускай мове. Калі прыгадаць, што шмат гадоў кіраваў гэтым тэатрам, а потым доўга працаваў заўлітам Артур Вольскі, а зараз застаецца вялікім нашым сябрам, то будзе зразумелая наша адданасць роднай мове. Асабіста я вырашаю ўсе пытанні, што тычацца мовы, стылістыкі, толькі з ім. І калі ўзнікаюць нейкія праблемы на тэлебачанні, радыё, я спасылаюся на імя і аўтарытэт Вольскага. І тады пытанняў няма. Бо ён валодае дзівосна прыгожай мовай. І размаўляць з ім — асалода.

— Зараз нашы культура і мастацтва перажываюць не лепшыя часы. На ваш погляд, якая перспектыва ў ТЮГа?

— Я вельмі хацела б пажадаць свайму тэатру, у першую чаргу, нейкага прарыву, каб лягчэй працавалася і праца аплачвалася па заслугах. Таму што ў гэтым тэатры могуць працаваць толькі фанатычныя людзі, адданыя гэтаму тэатру і менавіта гэтаму гледачу.

Наталля БУДЗЛОЎСКАЯ.

НА ЗДЫМКАХ: Вера КАВАЛЕРАВА ў спектаклі «Стваральніца цуду».

Фота Сяргея ДЗЕНІСЕНКІ.

галерэя майстроў

ПЕРШАЯ ВЫСТАВА ВОЛЬГІ БАБРОЎНІК

Пасля заканчэння Бабруйскага мастацкага вучылішча Вольга Бабро́ўнік тры гады працуе ў Мазырскім гарадскім Цэнтры адраджэння рамёстваў.

З унікальным рамяством, якое яна адраджае — роспіс велікодных яек, — могуць пазнаёміцца мазыране і госці горада.

Гэта рамяство амаль забытае. Каб яго засвоіць, Вольга вывучала па крупінках старажытныя кніжкі, знаходзіла людзей, якія яшчэ помнілі, як выглядалі размаляваныя яйкі.

У Палацы культуры нафтавікоў адкрыта персанальная выстава маладой мастачкі Вольгі БАБРОЎНІК (на здымку).

Сяргей ХАЛАДЗІЛІН, БелТА.

навіны з архіва

РАЗГРОМ МАСОНСТВА Ў МІНСКУ

З слоўніка, выдадзенага яшчэ пры Сталіне, вынікае, што "франкмасоны – гэта члены рэлігійна-філасофскага таварыства, якое ўзнікла ў XVIII стагоддзі ў Англіі, а затым распаўсюдзіла сваю дзейнасць на ўсю Еўропу. Франкмасоны – антыклерыкальная, але варожая рэвалюцыйнаму рабочаму руху арганізацыя". Як бачым, масоны, арганізацыя – і не Іосіфу, і не папу рымскаму. І не Гітлеру, дарэчы, які не аддзяляў масонаў ад камуністаў і чыніў гвалт над імі з асаблівай жорсткасцю.

У Расіі першая "вялікая ложа" ўзнікла з дазволу Пятра I, а пры Кацярыне II масоны аб'ядноўвалі апазіцыйна памяркоўнае крыло дваранства. Спрычыніліся да масонства і дзекабрысты.

Пакуль дакладна не ўстаноўлена, ці былі масоны ў Вялікім княстве Літоўскім. Хутчэй за ўсё, што не (не было патрэбы ў патаемнасці, якая ўзнікае звычайна пры таталітарных рэжымах), а вось у сувязі з інкарпарацыяй у склад Расійскай імперыі такая патрэба ўзнікла. Пэўныя групоўкі беларускай шляхты не пагадзіліся з уціскам расійскага самадзяржаўя і пасля разгрому паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі пачалі ствараць тайныя таварыствы, каб у іх прапаведаваць ідэі роўнасці і братэрства гэтак жа, як іх спавядалі рускія дзекабрысты. Мэты такіх таварыстваў азначыў у сваіх паказаннях пасля падзей на Сенацкай плошчы набліжаны да рускага двара дзекабрыст генерал Міхаіл Арлоў: "Я вырашыў утварыць тайнае таварыства маладых людзей, каб змагацца супраць карупцыі і іншых правапарушэнняў, якія даволі часта адзначаюцца ва ўнутраным кіраванні краінай".

Не выключана, што, выкарыстоўваючы сувязі з ложамі ў расійскай сталіцы, беларускія таварыствы "вольных муляраў" хацелі паўплываць на стан спраў у роднай старонцы. Калі глянуць на склад ложы "Полуночный факел", то можна заўважыць, што ў яе ўваходзілі даволі ўплывовыя людзі з ліку мясцовай шляхты: засядацель Мінскай крымінальнай палаты, а пазней старшыня Мінскага губернскага міравога суда Казімір Ваньковіч, памешчыкі Слуцкага павета Антон Язерскі, Міхаіл Непаканчыцкі, Іосіф і Фларыян Вайніловічы, слуцкія адвакаты Павел Пяткевіч і Уладзіслаў Давыдоўскі, памешчыкі Бабруйскага павета Томаш Замайскі, Людвіг Быкоўскі, Ксаверы Венцлавовіч, радзівілаўскія канюшыя Томаш Гендзерон і Іосіф Фальскі, слуцкі земскі спраўнік Вікенцій Булгарын, яго родзіч памешчык таго ж павета Міхаіл Булгарын і іншыя.

Невядома, ці сутыкаўся нейкім чынам з мінскімі ці слуцкімі членамі тайных таварыстваў вядомы журналіст, празаік і выдавец пушкінскай пары, ураджэнец Міншчыны Тадэвуш Булгарын, але дакладна вызначаны яго сувязі з ліберальнымі польскімі літаратарамі, выкладчыкамі Віленскага універсітэта, што ўваходзілі ў таварыства шубраўцаў. У 1819 годзе Булгарын, які змагаўся на баку Напалеона супраць расійскіх войскаў, быў абраны ганаровым членам гэтага таварыства.

Пэўна, свабодалюбства адчувалася не толькі ў Вільні, але і ў Мінску. Доказ таму — прозвішчы масонаў, якія можна сустрэць сярод удзельнікаў пазнейшых антырасійскіх выступленняў 1831 і 1863 гадоў.

Не выключана, што беларускія масоны, звязаныя са сталічнымі тайнымі таварыствамі ў Санкт-Пецярбургу, пацярпелі ад агульнай здрады. Ускосна пра гэта сведчыць той факт, што разгром беларускіх масонаў царскай ахранкай прыпадае якраз на перыяд расправы з удзельнікамі снежаньскага паўстання на Сенацкай плошчы.

З дакумента, што адшукаўся ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі:

"Блаженной памяти его императорское высочество цесаревич великий князь Константин Павлович повелением, последовавшим на имя предшественника моего бывшего гражданского губернатора (что ныне сенатор) Гечевича от 14 января 1826 года за № 55 предписать изволил: истребовав от комитетов масонских лож, существовавших в Минске, Несвиже, Слуцке и других местах Минской губернии, все масонские архивы и складочные деньги и, взяв с сих последних подлежащие отчеты, учредить для разсмотрения всего того особливый комитет и о том, что впоследствии окажется, донести его величеству.

По таковому повелению означенные масонские архивы, вещи и счета деньгам истребованы, а для разсмотрения оных учрежден был в том же 1826 году в городе Минске комитет, который, окончив возложенную на него порученность, донес о найденном им в архивах масонских лож. Из донесения сего видно, что в Минской губернии учреждены были пять масонских лож, а именно в Минске — две, Несвиже — две и в Слуцке — одна.

В сих ложах найдены разные вещи, как то: столы, стулья, подсвечники и тому подобная движимость, равно человеческий скелет, а в архивах их дипломы награждения лож, патенты на степени, речи масонским членам при заседаниях, в ложах произносимыя, разныя письма, масонские печати, знаки и книги прихода и расхода сумм, бывших в обращении по сим ложам.

При закрытии означенных лож считались в недоимке и подлежали к поступлению денег (как видно из прилагаемой ведомости) золотом 522 и серебром 3012 руб. 40 1/2 копейки..."

Высвятленне ўсіх абставін дзейнасці масонскіх лож і іх маёмаснага стану заняло шмат часу. Аб усім, што было знойдзена, мінскі губернатар Гечэвіч давёў да ведама цэсарэвіча Канстанціна і запытаў, што рабіць з грашамі і паперамі. У дазволе ад 24.01.1829 года за № 18 цэсарэвіч прадпісаў усю рухомасць, годную да ўжытку "по сорвании с некоторых вещей масонских знаков", аддаць у мінскі Марыінскі шпіталь, а паперы і масонскія знакі захоўваць сакрэтна ў асобным месцы. Шпіталю перадаваліся і грошы масонаў.

Трэба адзначыць, што Марыінскі шпіталь, пабудаваны за колькі гадоў перад вайной 1812 года на асабістыя сродкі членаў Мінскага таварыства дабрачыннасці, не карыстаўся ў мясцовых уладаў асаблівай павагай. Біскуп Дзядзерка, які выступіў у свой час ініцыятарам яго стварэння, публічна з амбону вітаў прыход напалеонаўскіх войскаў у Мінск і супрацоўнічаў з французамі, за што пазней усе дабрачынцы трапілі да расійскіх уладаў у апалу. Гэта, аднак, не перашкодзіла таварыству заставацца асяродкам беларускасці ў Мінску.

Рашэнне цэсарэвіча Канстанціна аб перадачы грошай масонаў дабрачынцам мінскі грамадзянскі губернатар сакрэтным пісьмом давёў да ведама мінскага губернскага прадвадзіцеля дваранства (маршалка). У пісьме яму тайна даручалася паведаміць аб прынятым наверсе рашэнні тагачаснаму прэзідэнту Таварыства дабрачыннасці епіскапу Ліпскаму, што і было зроблена.

Зразумела, адбіраючы грошы ў адных беларусаў і перадаючы іх іншым суайчыннікам, цэсарэвіч клапаціўся не пра беларускі народ. Ён імкнуўся звесці аднадумцаў у грашовых разборках, пасварыць паміж сабой. Удалося гэта яму ці не — сёння адназначна сказаць цяжка. Вядома толькі, што пасля перадачы асноўнага масонскага скарбу дабрачынцам з членаў тайных таварыстваў улады яшчэ доўгі час не давалі жыць спакойна, працягвалі "выбіваць" нядоімку (невядома, як было ўстаноўлена, што быццам бы па іх віне ў касах ложаў адсутнічалі пэўныя сумы).

З пісьма старшыні мінскага губернскага міравога суда Казіміра Ваньковіча губернскаму маршалку:

"На требование Вашего Превосходительства честь имею ответствовать, что я от Масонов никаких денег не брал и ни в чем не заимствовал и потому не нахожусь в обязанности требуемых 25 1/2 червонцев платить. А всегда, что следовало, мною уплачиваемо было.

1839 года июня 25 дня".

Звернем увагу на тое, што Ваньковічу за яго масонства не давалі жыць спакойна трынаццаць гадоў. Зрэшты, як і іншым. З ліста прэзідэнта Віленскай евангелісцка-рэфарматарскай калегіі памешчыка ігуменскага павета, кавалера Адама Эсткі: "...Никакая недоимка на мне числиться не могла".

Адстаўны паручнік артылерыі, памешчык Віленскага павета Канстанцін Каменскі ў сваім лісце адносна згаданых фінансавых прэтэнзій напісаў наступнае: "...После данной мною первой подписки еще в прошлом 1821 году я выбыл из состава масонского общества..." Ці азначае гэта, што за некаторымі членамі ложаў сачылі яшчэ задоўга да паўстання дзекабрыстаў? Зрэшты, што за падпіску даваў Камінскі і ўвогуле, што спавядалі і куды імкнуліся гэтыя людзі?

Адказ на гэта пытанне ляжыць у больш глыбокім і дэталёвым вывучэнні дакументаў айчыннай гісторыі.

Віктар ХУРСІК.

спадчына

Ёсць у Беларусі, у Івацэвіцкім раёне Брэсцкай вобласці, горад Косава, які заўжды блытаюць з вядомым балканскім цёзкам. А за тры кіламетры ад горада, калі ісці па амаль непрыкметнай сцяжынцы праз густы лес, можна ўбачыць велізарны палац у псеўдагатычным стылі.

КОСАЎСКІ ЗАМАК

Пачалося ўсё ў 1838 годзе. Буйны прамысловец граф Вандолін Пуслоўскі, сям'я якога валодала мясцінай амаль ужо стагоддзе, надумаў пабудаваць палац. Варшаўскі архітэктар Францішак Яшчольд, запрошаны Пуслоўскім, быў не толькі таленавітым архітэктарам, але і, на мой погляд, вельмі рамантычнай натурай. Таму палац выглядае як сапраўдны сярэдневяковы замак. Гранёныя зубчастыя вежы, вузкія пераходы, высокія стрэльчатыя аркі праёмаў і нішаў, машыкулі.

У замку было 132 пакоі. Кожны з іх меў сваё прызначэнне і выгляд. У чорнай зале гралі ў карты, у белай была гасціная. У больш экстравагантнай параднай зале знаходзілася рэдкае на той час дзіва: акварыум з экзатычнымі рыбамі. У замку існаваў і звярынец, у якім жыў нават леў. Кажуць, што ноччу яго выпускалі, і ён да світання пільнаваў сон жыхароў палаца.

Але, на жаль, сёння толькі сцены нагадваюць пра замак. Лёс косаўскага палаца сумны. Пасля чарговага паўстання Каліноўскага (1863–1864 гады) ён быў адабраны ў Пуслоўскіх і аддадзены маскоўскай арыстакратыі — князям Трубяцкім і Альдэнбургскім. І хаця ў час першай сусветнай вайны ён моцна пашкоджаны, але яшчэ быў прыстасаваны пад староства Косаўскага павета. Пасля ж Вялікай Айчыннай вайны знаходзіцца ў разбураным стане.

У сярэдзіне 70-х была спроба адрэстаўрываць палац. Але, на жаль, няўдалая. Пасля «рамонту» ў замак сталі пранікаць грунтовыя воды, абваліліся сцены, пачаў крышыцца цэмент...

Сёння палац варты жалю. Яго акружыў даволі вялікі падлесак. Дрэвы пускаюць карані нават у сценах замка.

Але знайшліся добраахвотнікі, якія вырашылі ўратаваць замак. Студэнты істфака, журфака і іншых факультэтаў БДУ і іх сябры арганізавалі ініцыятыўную групу «Косаўскаму палацу — жыць!». І ў сярэдзіне верасня мінулага года пачалі першы этап аперацыі: убралі смецце, зрабілі драўляны насціл, выкарчавалі дрэвы, якія раслі ў сценах.

Не засталіся раўнадушнымі і мясцовыя жыхары. Замкам яны ганарацца, таму ініцыятыўнай групе былі рады. Частавалі яблыкамі, а адзін мужчына дапамагаў падвозіць рэчы на сваім «Запарожцы». Гарвыканкам падтрымаў маральна, бо сродкаў, на жаль, на рэстаўрацыю пакуль няма.

Сёлета студэнцкі "дэсант" зноў высадзіўся ў Косаве. І на гэты раз не толькі прыбіралі, а і арганізавалі фестываль «Музыкальныя сцены». Назва звязана з легендай пра замак, сцены якога быццам звінелі пры воплесках.

Зараз студэнты чакаюць наступнае лета: Косава прыцягвае да сябе.

Адэліна ПАПОВА.

весткі з суполак

«МАЛАНКА» — У СІБІРЫ НЕ ІНШАЗЕМКА

Газета "Маланка" выдаецца ў Іркуцку беларусамі для беларусаў і існуе на грамадскіх пачатках. Яе заснавальнік – Іркуцкае таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага. Выданне расказвае пра жыццё беларусаў, якіх лёс закінуў у Расію – у далёкую халодную Сібір. "Маланка" паведамляе таксама пра падзеі, што адбываюцца на Бацькаўшчыне.

Дасылаюць сібірскія беларусы сваю газету і чытачам з ЗША, вядомым дзеячам культуры Беларусі. У адным з апошніх нумароў Радзім Гарэцкі, звяртаючыся да рэдактара "Маланкі" Алега Рудакова, падзякаваў яму за руплівую працу: "Мяне, безумоўна, цікавіць жыццё ўсіх беларусаў, у тым ліку і сібірскіх. Усім жадаю поспехаў, здароўя і новых здзяйсненняў!" А чытач з Амерыкі Марат Клакоўскі пазначыў: "Калі ў нас у Нью-Ёрку пра Іркуцкае таварыства беларускай культуры людзі яшчэ нешта ведаюць, то ў іншых гарадох ЗША, думаю, што чулі нямногія. А хацелася б, каб пра актыўную дзейнасць беларусаў у Прыбайкаллі ведалі шырэй".

Як адзначыў Алег Рудакоў у адным са сваіх артыкулаў "І ў горадзе Брацку беларусы аб'ядналіся", у Іркуцкай вобласці, або, як яшчэ прынята называць гэты край, Прыбайкаллі, налічваецца прыблізна 50 тысяч беларусаў і іх нашчадкаў.

Зрэшты, перапіс 2002 года выдасць нам больш дакладную лічбу нацыянальнага складу вобласці. Аўтар паведамляе, што за шэсць гадоў існавання Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага зроблена вельмі шмат для адраджэння цікавасці да сваёй нацыянальнай культуры сярод беларусаў Прыбайкалля. Пры таварыстве існуе пяць творчых ансамбляў. У трох з іх — фальклорным "Ленушка", дзіцячым танцавальным калектыве "Пралескі" і ансамблі "Ручнічок" — задзейнічана моладзь. У час свята ў Новасібірску, якое праходзіла ў чэрвені, — Дзён славянскай духоўнасці і культуры беларусаў паспяхова прадстаўлялі фальклорны гурт "Ленушка", а таксама ансамбль беларускай песні "Лянок" з Цюмені і вядомыя "Сябры" з Мінска. Заключным акордам свята ў Новасібірску стала знакамітая песня гурта "Сябры" "Полька беларуская", пад якую задзірыста танцавалі артысты "Ленушкі" і "Лянку". На ўсіх пляцоўках горада беларусаў прымалі надта цёпла. У Бердску ансамбль "Ленушка" выступіў на ўрачыстым адкрыцці Беларускай праваслаўнай царквы святой Ефрасінні Полацкай.

Адзначылі беларусы-сібіракі 120-годдзе з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа. Намаганнямі маладзёжнага клуба "Крывічы" быў завершаны рамонт музея-майстэрні "Беларуская хатка". З першага верасня музей у Іркуцку пачаў прымаць наведвальнікаў, якія маюць магчымасць пазнаёміцца з прадметамі побыту беларускіх перасяленцаў, убачыць крынкі, глечыкі, гарлачы, ступу, а таксама вырабы традыцыйных нацыянальных рамёстваў — вышытыя і тканыя ручнікі, палавікі, рэчы, плеценыя з саломкі. Збор музейных экспанатаў працягваецца. І газета звяртаецца да беларусаў з прапановай — папаўняць надалей запаснікі "Беларускай хаткі".

Асобная старонка "Маланкі" адводзіцца паведамленням з Беларусі. Рубрыка мае назву "Весткі з Бацькаўшчыны". Апошнім часам тут выкарыстоўваецца інфармацыя як з "Голасу Радзімы", так і прадастаўленая "ЗБС "Бацькаўшчына". Суайчыннікі з далёкай Сібіры з аднаго з апошніх нумароў маглі, напрыклад, даведацца пра тое, што ў самым старажытным горадзе Беларусі Полацку прайшлі ўрачыстасці з нагоды Дня горада, які адзначыў сваё 1140-годдзе.

На святочных мерапрыемствах упершыню быў выкананы гімн Полацка, а само свята праходзіла пад афіцыйна прынятым сёлета сцягам горада. Гэтае палотнішча мае тры вертыкальныя паласы — дзве блакітныя па краях і белую. На цэнтральнай белай паласе знаходзіцца відарыс герба Полацка — паруснік, які плыве па Дзвіне. Да святкавання была прымеркавана вялікая канцэртная праграма, прайшлі шматлікія выставы, у тым ліку, прысвечаная 900-гадоваму юбілею Ефрасінні Полацкай — "Асветніцы з роду Усяслава".

Інфармацыя "Беларускія магістры" паведаміла, што зараз беларусы, якія выязджаюць за мяжу, маюць магчымасць атрымаць дакумент на рускай і англійскай мовах, які пацвярджае ўзровень атрыманай адукацыі ў адпаведнасці з міжнародна прызнанымі нормамі — бакалаўр, магістр, доктар філасофіі і д.п. Да гэтага часу такі сертыфікат пасля адпаведнай экспертызы выдаваўся толькі ў суседняй Расіі — у Маскве Міжнароднай камісіяй па прызнанні эквівалентнасці вучэбных курсаў, дакументаў аб адукацыі. З канца мінулага года Міжнародная арганізацыя сяброў БДУ стала прадстаўніком у Беларусі "ІНКОРВНУ — XXIII", пры якім і створана адпаведная камісія па эквівалентнасці. За гэты час у краіне атрымалі сертыфікат больш за дзесяць тысяч чалавек.

Пазнаёміла старонка "Весткі з Бацькаўшчыны" і з апошнімі спартыўнымі навінамі, расказала пра дасягненні беларускіх спартсменаў.

Пішуць у газету і беларусы Літвы. У прыватнасці, прэзідэнт Згуртавання беларускіх грамадскіх арганізацый у Літве Лявон Мурашка пазнаёміў чытачоў "Маланкі" з тым, як развіваецца беларуская нацыянальная школа ў яго краіне, што там існуе беларуская сярэдняя школа імя Францішка Скарыны, у якой навучаюцца 170 вучняў. З 1993 года пры Віленскім педуніверсітэце дзейнічае на чале са спадарыняй Ліліяй Плыгаўкай кафедра беларускай мовы і этнакультуры, якая выпусціла ўжо 39 магістраў. З мінулага года ў Вільнюсе ў дзіцячым садзіку № 191 заснавана беларуская група для дзяцей. У 1997 годзе з'явіліся беларускамоўная газета "Рунь" і выдавецтва з аднайменнай назвай. Такім чынам, беларусы Літвы ганарацца, што маюць магчымасць выхоўваць дзяцей у беларускім дзіцячым садзіку, у адзінай у свеце беларускай поўнай сярэдняй школцы і даваць ім веды на беларускай кафедры педагагічнага універсітэта.

Як, напэўна, і ўсе, хто выпускае беларускамоўныя газеты, рэдактар "Маланкі" і яго памочнікі мараць, што тыраж выдання будзе павялічвацца, што яно будзе выходзіць у колеры, на добрай паперы, мець шмат старонак, зробіцца яшчэ больш цікавым і папулярным... Дык пажадайма сібірскай "Маланцы" поспехаў!

Наталля БОГУШ.

прэзентацыя

Прыгожыя дзяўчаты ў нацыянальных строях з рамонкавымі вяночкамі на галаве на фоне снапоў збожжа і сціплы надпіс: "Беларусь". Гэта вокладка кнігі, прэзентацыя якой адбылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь. Усё ў гэтай кнізе – ад канцэпцыі і мастацкага афармлення да выдання – зроблена адным чалавекам – Дзянісам Раманюком. Чытачам "Голасу Радзімы" знаёмае гэта прозвішча па яго артыкулах у газеце і па першай спробе як выдаўца, калі Дзяніс падрыхтаваў і выдаў манаграфію "Беларускія народныя крыжы" – вынік вялікай працы яго бацькі, вучонага-этнографа Міхася Раманюка. Спроба аказалася ўдалай: манаграфія атрымала тры вышэйшыя ўзнагароды на рэспубліканскім конкурсе "Мастацтва кнігі".

"БЕЛАРУСЬ" ДЗЯНІСА РАМАНЮКА

І вось завершана чарговая праца. Дзяніс Раманюк падрыхтаваў не проста фотаальбом, а кнігу, з якой можна атрымаць інфармацыю пра нашу краіну ў сціплых памерах, але дастатковую, каб уявіць, што такое Беларусь. Кніга ў першую чаргу — сувенір, з якім не сорамна паехаць за мяжу, падарыць свайму знаёмаму ці госцю. Зроблена яна ў двух варыянтах — беларуска-нямецкім і англійска-рускім, што значна пашырае кола яе чытачоў. Складальнік свядома пакінуў за межамі выдання сацыяльна-эканамічныя аспекты Беларусі, а засяродзіў увагу на гісторыі, народным мастацтве, архітэктуры, прыродзе. Асобны раздзел прысвечаны нашай сталіцы — Мінску. Сціпласць інфармацыі дапаўняюць 80 фотаздымкаў вядомых беларускіх фотамастакоў: Віталя і Паўла Бараноўскіх, Віктара Ганчарэнкі, Валянціна Ждановіча, Анатоля Клешчука, Георгія Ліхтаровіча і іншых.

Своечасовасць і неабходнасць такой кнігі адзначылі ў сваіх прамовах намеснік міністра культуры Беларусі Валерый Гедройц, рэктар Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры Уладзімір Скараходаў. Эстэтычныя якасці кнігі ацанілі прэзідэнт Беларускага саюза дызайнераў Дзмітрый Сурскі і прарэктар Беларускай акадэмі мастацтваў Міхаіл Баразна. Вандроўнікам і самаадданым працаўніком назваў Дзяніса вядомы паэт Леанід

Дранько-Майсюк. У гэтым сэнсе ён абсалютны наследнік свайго бацькі і духоўны — Язэпа Драздовіча. «Выданне кнігі "Беларусь", — адзначыў Л.Дранько-Майсюк, — гэта працяг нашай нацыянал-дэмакратычнай традыцыі, якая ўзнікла ў пачатку мінулага стагоддзя працай братоў Луцкевічаў, Ластоўскага і іншых. Змест гэтай традыцыі акрэсліваецца простымі і зразумелымі ўсім словамі: мы верым у лепшае, мы верым у Беларусь, бо яна вышэй за ўсялякія уніі і саюзы. Беларусь ніколі не знікне. Вось чаму гэта выданне такое светлае, прыгожае і сёння вельмі патрэбнае». З гэтым нельга не пагадзіцца. Застаецца пажадаць поспеху новай кнізе аб Беларусі, а Дзянісу Раманюку — плёну ў нялёгкай выдавецкай справе.

НА ЗДЫМКАХ: новая кніга чакае сваіх чытачоў; аўтар і выдавец кнігі "Беларусь" Дзяніс РАМАНЮК.

Тэкст і фота Яўгена КАЗЮЛІ.

зваротная сувязь

ЛАТВІЯ

ЮБІЛЕЙНАЯ ВЕЧАРЫНА Ў РЫЗЕ

3 лістапада, у дзень нараджэння Якуба Коласа, у Рызе Латвійскае таварыства беларускай культуры "Сьвітанак" ладзіла літаратурна-музычную вечарыну, прысвечаную 120-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Арганізатары свята падрыхтавалі выставу кніг нашых славутых юбіляраў, а таксама выставу паштовак і фотадакументаў, прысвечаных іх жыццю і творчасці. Ганаровымі гасцямі на вечарыне былі вядомыя латышскія пісьменнікі Андрыс Веянс і Кнут Скуйньекс, першы сакратар амбасады Беларусі ў Латвіі Дзмітрый Шкурдзь, загадчыца аддзела нацменшасцей Упраўлення натуралізацыі Латвіі Айна Балашка, прафесар Латвійскага універсітэта, аўтар кнігі "Беларусы ў Латвіі" Ілга Апінэ, старшыня латвійскай суполкі Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, кавалер ордэна Францішка Скарыны Мірдза Абала, беларускія прадпрымальнікі.

Разам з сябрам "Сьвітанка", старшынёй Аб'яднання мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар" Вячкам Целешам, мне давялося весці аповед аб жыцці і творчай дзейнасці Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Яскравай ілюстрацыяй багатай спадчыны нашых песняроў стала трохгадзінная літаратурна-музычная кампазіцыя з вершаў паэтаў, песень на іх словы, а таксама твораў, прысвечаных Коласу і Купале. Да юбілею таварыства "Сьвітанак" выпусціла каляровую паштоўку з рэпрадукцыяй карціны Вячкі Целеша "Дзвіна-Даўгава – маці наша" з выявай вядомага латышскага паэта Яніса Райніса і Янкі Купалы на фоне Дзвіны-Даўгавы. Гэтыя паэты сябравалі, і Янка Купала ў свой час быў у Рызе. Верш госця вечарыны народнага паэта Латвіі Андрыса Веянса ў перакладзе на беларускую мову С.Панізніка "Янка Купала ў Рызе" чытала вядучая вечарыны Таіса Бачкарова, а сам паэт расказаў аб сваіх сустрэчах з Якубам Коласам і падарыў "Сьвітанку" кнігу сваіх вершаў. Ад кавалера ордэна Трох зорак паэта Кнута Скуйньекса таварыства атрымала яго цікавую кнігу, дзе сабраны вершы розных паэтаў на 72-х еўрапейскіх мовах, а таксама змешчаны пераклады іх на латышскую мову, зробленыя спадаром Скуйньексам. З усёй беларускай паэзіі перакладчык выбраў верш Янкі Купалы "А хто там ідзе" і прачытаў на вечарыне ў сваім перакладзе на латышскую мову.

У зале сярод гледачоў можна было ўбачыць людзей розных пакаленняў: ад школьнікаў да зусім сталых, і выканаўцы таксама былі самага рознага ўзросту. Гурт "Вавёрачка" Рыжскай беларускай асноўнай школы выканаў песні "З Купалам у сэрцы" М.Яцкова на словы С.Панізніка, "Мой родны кут" І.Лучанка, "Сэрцу Беларусі" А.Чыркуна на словы латышскай паэтэсы Мірдзы Кемпэ (пераклад на беларускую мову С.Панізніка) і інш. Упершыню ў такім свяце ўдзельнічала студэнтка харавога аддзялення Латвійскага педінстытута Аляксандра Ларыёнава, у яе выкананні прагучалі песні "Спадчына", "Жураўлі на Палессе ляцяць" ды іншыя, акампаніравала ёй маці, выпускніца Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Людміла Кароль. Асобую цікавасць у прысутных выклікалі артыстычна выкананыя Уладзімірам Юркаўцом урыўкі з паэмы Коласа "Новая зямля": "Дзядзька ў Вільні", "Раніца ў нядзельку" ды іншыя, а таксама ніколі ў савецкі час не друкаваныя вершы Янкі Купалы ў выкананні сябра "Сьвітанка" Станіслава Клімава.

І, як заўсёды, гледачы ніяк не хацелі адпускаць са сцэны пастаянную ўдзельніцу "сьвітанкаўскіх" вечарын таленавітую спявачку-прыгажуню, студэнтку 6-га курса Латвійскай медыцынскай акадэміі, выпускніцу Беларускай нядзельнай школы Ілону Варатнікову. Акрамя ўжо вядомых песень "Явар і каліна", "Нёман", "Бярозка", Ілона выканала шэраг новых, падрыхтаваных спецыяльна да юбілею нашых сусветна вядомых класікаў. Адну з песень "Ізноў спаткаліся мы" на словы К.Буйло напісала спецыяльна для Ілоны сябар "Сьвітанка", выпускніца Маладзечанскага музычнага вучылішча Наталля Камілеўская. Яна прачытала таксама верш свайго бацькі, беларускага паэта Барыса Кастаненкі "О, верш душы", прысвечаны Купале і Коласу. Акрамя Наталлі Камілеўскай, акампаніраваў Ілоне вядомы ў Рызе беларускі музыкант, выпускнік музычнага аддзялення Мінскага педуніверсітэта Сяргей Калеснікаў.

Дзякуючы спадару Калеснікаву, і на другой частцы вечарыны, за сталом, нікому не давялося сумаваць. Гасцям-латышам вельмі спадабаліся беларускія нацыянальныя стравы ды, вядома ж, беларускія народныя танцы і песні. Кіраўніцтва таварыства "Сьвітанак" выказала падзяку беларускім прадпрымальнікам, якія дапамаглі ў падрыхтоўцы вечарыны: Валянціне Варатніковай, Янку Кабановічу і Ігару Шчаснаму.

Таццяна КАЗАК,
старшыня ЛТБК "Сьвітанак".

нататкі з нагоды

КРЫНІЦЫ ТВОРЧАСЦІ

Дзіўна, але сучасныя кніжныя выданні адразу становяцца рэдкасцю (рарытэтам), як зборнік вершаў і апавяданняў «Ядрыца», выдадзены сёлета ў Мёрах. А мо зборнічак у 300 паасобнікаў – нармальны тыраж для раёна? "Ядрыца" і ёсць той надзвычайны выпадак для паэтычнага судакранання (тут не выключэнне і проза) з суайчыннікамі, а праз іх – з родным мацерыком, які таксама чуйны і ўніклівы, бо натхняе ўсіх нас, народжаных на Бацькаўшчыне.

Заспяваю звонка
і распраўлю крылы —
Зазірну з нябёсаў
на прастор зямны.

Так прамаўляе адна з аўтараў зборніка "Ядрыца" Юлія Дземідзёнак. Не здрадзіць роднаму — клопат маладой паэткі Юліі. Думаецца, што гэта галоўнае ў глабальны век для ўсіх насельнікаў, і не толькі дзяржавы Беларусь. На тэлеэкране відаць, як у адкрытым космасе астранаўтаў жывіць "пупавіна". Без повязей любові, роднасці, без нацыянальнай ідэнтыфікацыі душы будзе гібець і грамадства, і зямля айчынная, парода наша і прырода ў значэнні "паходжанне, сутнасць". Адчуваю, што і словы з індабалцкімі каранямі нашэптвала прашчурам жульвіца пры жэгінах.[1] Сама мова — частка прыроды, выгукваецца пры родах і надаецца да скону.

"Ядрыца" і асвечана вось гэтай еднасцю прыроды, што вакол нас, і прыродай "у душы чалавека". Апошнія словы ўзяты з своеасаблівага эпіграфа да зборніка (выказванне М.Прышвіна). Духоўны скорам — ядрыцу — прапанавалі нам складальнікі Л.Касаты і М.Ролік. Спожыць "Ядрыцы" ў тым, каб чытачы ўслед за Браніславам Марозам маглі яшчэ раз уразумець, дзе пачынаецца наша Радзіма. І мне стала вядома: у Плейках, на Масеўскім полі, за Каменполем, Чэрасамі, пад Дзісной, на Волце, Мёрыцы, вакол возера Мёрскага і — у саміх Мёрах, дзе

Злез на зямлю з мясцін
няблізкіх вершнік,
На сук бярозы ўскінуў павады.
І, склаўшы лодкай
цёплыя далоні,
Напіўся ён гаючае вады.

(Браніслаў Мароз. "Балада пра Міёры").

І гэта напісана не толькі для сваёй радасці. Аўтары "Ядрыцы" выступаюць летапісцамі, калі сваім творчым радком робяць меткі-засечкі, каб абазнаць айчынную дзялянку, вынесці паэтычна-празаічны прахарчунок "на свет цэлы":

Мілы, незвычайны мой куток!
Стань вядомым
на усёй прасторы!

(Марына Чучман. "Міёрская зямля").

Як мне прыдзвінская зямля, так і Людміле Сурме яе любімая вёска — "вечны ўспамін". Дагэтуль гучаць мне, як і Генадзю Дзямешку, вясельныя, велікодныя песні. Дарэчы, нашы валачобныя песні амаль не маюць аналагаў у фальклоры суседніх славянскіх народаў; даследуючы арэал іх бытавання, вучоныя вызначалі этнаграфічныя межы беларусаў. І калі лявонпальскі "Музей Радзімазнаўства" будзе мець апаратуру, я пакажу ўсю сваю багатую калекцыю запісаў валачобнай паэзіі Прыдзвіння.

У аўтараў "Ядрыцы" былі і ёсць таленавітыя папярэднікі — нашы землякі. Ад іх засталіся не толькі песні, прымаўкі, показкі, але і найменні. Адзін дзядзька пад Даўгінавам мне назваў па імені кожную лапінку навакольнай зямлі. Чаго вартая такая прозва ручая — Лебядзінец! Найменні — люстэрка зямлі. У Бабышках не ведалі, да прыкладу, што ёсць балота Ельня. Гаварылі пра балота Гулякі. Там загінулі пры карнай экспедыцыі многія мае родзічы.

Добра, што прысвячэнні ў "Ядрыцы" напоўнены нашымі "генеалагічнымі" гідронімамі, тапонімамі. Але ж у "Беларускай энцыклапедыі" няма наймення Мерыца. Ёсць рака Мёрыца, якая выцякае з Мёрскага возера. "Мёры, горад у Віцебскай вобл." мае там такі пасыл: "гл. Міёры". Міёры — назва адміністрацыйная. Але паэта мо ў першую чаргу павінны зацікавіць першародныя тытулы: Мёры, Міры, Меры.

Наўніна падаецца нам афіцыйна-аголенай, даўніна ж фантастычна знітаваная. Хто не ведае, што на Гродзеншчыне (Гарадзеншчыне) ёсць рэчка Гаўя?! Цёзка беларускай Гаўі цячэ і па Латвіі. Мала таго, леваруч латвійскай Гаўі, за 46 кіламетраў ад Валкі, стаіць гарадок — цёзка нашага раённага цэнтра: Меры. Мо хітрыя угра-фіны так пераблыталі карты? Яны пакінулі на Беларусі знакі сваёй прысутнасці.

Нашым продкам "цяплей" вымаўлялася літара "ё", чым "е", таму і загучалі ў вуснах маіх бацькоў Мёры, ёсць, ёлка... "Лягчэй" было прамаўляць вакно, чым акно, Восіп, чым Іосіф... Згадайце рускае слова "есть", украінскае "мэд".

У Ірыны Шаркель я з хваляваннем прачытаў пра Волту. Сам у юнацкія гады складаў каля гэтай рачулкі вершаняты. І не ведаў тады, што праз Румынію цячэ і ўпадае ў Дунай рака Олт. Кажуць, што нашы прашчуры прыйшлі на землі балтаў з Дуная. "Дунай" цячэ ў народных песнях. Відаць, па завядзёнцы, было далучана да Олт звыклае "в", а назва закруглена канчаткам "а". З румынскай ракі і пайшло найменне нашай Волты. І яшчэ адзін цёзка ёсць у Волты. Гэта такі гідронім, як Влтава. Гуляйце, валачобнікі-мёрцы, па ўсёй Еўропе: во колькі маем суродзічаў-сутворцаў!

Таму апяваць свае радаводныя вытокі нам трэба ў поўную сілу. Тут мала напісаць: "Ах, якія нашы мясціны!" Варта не толькі дэкларацаць "прыгажосць лясоў, рэчак і палёў", а выявіць у вобразных дэталях аздобу "яркіх зор і снежных зімаў".

Парадавалі і аўтары твораў для маленькіх чытачоў. А для іх, як вучаць крытыкі, трэба пісаць так, як і для дарослых, толькі значна лепш. Запомніліся і Дзед Мароз Веры Новік, і сарока Алесі Гвяздоўскай.

Усцешна, што проза Франца Сіўка набывае ўсё большы аўтарытэт у даследчыкаў нашай літаратуры. Высокі рэйтынг набыў яго "Удог". "Запісы" — люстрадзёны Прыдзвіння. У шчымлівым апавяданні Людвіга Касатага я адчуў недагляд, характэрны для многіх нашых літаратараў, якія аўтарскую мову пераносяць на мову герояў свайго твора. Ні мая бабуля з Бабышак, ні Валіна матуля з Навасёлак, канешне ж, не ведалі, што такое так званая "наркомаўка".

Берагчы прыроду нашу і яе дзіцятка — мову мы павінны не "тыднямі", не "месячнікамі". Хай кампенсацыяй недаежы будзе "Ядрыца". Адчуваю ў ёй спаталенне меры і веры. І спадзяюся на новыя творчыя ручайкі. А для натхнення ім — колькі слоў ад Якуба Коласа: "...прырода — найцікавейшая кніга, якая разгорнута перад вачамі кожнага з нас. Чытаць гэту кнігу, умець адгадаць яе мнагалучныя напісы — хіба ж гэта не ёсць шчасце?.."

Сяргей ПАНІЗНІК,

выпускнік літаб'яднання "Ручаёк" (1959 г.).

[1] Вярба пры азяродах.

літаратурная старонка

Алесь НАВАРЫЧ

ПАНІ З САБАЧКАМ, або ПАД КВЕТКАМІ МАГНОЛІЙ...

АПОВЕСЦЬ

Малюнак Вячаслава ІГНАЦЕНКІ.

Аднойчы Архірэй мяняў у валютчыка, гэта значыць у Гудзевіча, даляры і паказаў яму абцёрханы замежны часопіс са сваім творам. Мяняла глянуў на страшную голую, — адныя рэбры выпінаюць, — жанчыну, знятую каля вядра з попелам. На попеле ляжаў дазіметр і паказваў неймаверную колькасць мікрарэнтген. Мяняла хмыкнуў і спытаў, колькі заплацілі за здымак. Фатограф назваў лічбу. Мяняла яшчэ з большым недаверам хмыкнуў. Архірэй дастаў жмут даляраў (цётчыны гэта былі даляры — якраз яна здала свіней). Гудзевіч здзівіўся. Не грашам — Архірэю. Трэба ж. Такі свой, некідкі на выгляд кудлач, а ў замежжа прабіўся. Праўда, невядома, што ў той фотакартачцы зацанілі замежнікі? Сядзіць на бруднай падлозе голая сухарэбрыца, закрыла твар рукамі, праз пальцы толькі "чалавечкі" бліскаюць, і ўсё! "Чарнобыльскай мадоннай" падпісана. За што процьму "баксаў" адвалілі? Яны што, там, на Захадзе, збрэндзілі? Ці гэта за тыя вісюлькі, якія і грудзямі не назавеш, такія грошы плаціць? Вырашыў мяняла запрасіць мясцовую знакамітасць павячэраць — без чаркі ў сучасным мастацтве не разбярэшся.

"Не, — кажа Архірэй. — Чаго я пайду?"

Гудзевіч тады прапануе выдаць фотаальбом. Карацей, дамовіліся.

"Ты прыхапі фотаапарат", — запанібрацкі сказаў Гудзевіч на развітанне. Ён фатографа толькі і памятаў, як некалі, яшчэ школьнікам, на пашпарт здымаўся. Худы быў тады фатограф, без барады, а зараз цэлы корч выгадаваў.

Дома Гудзевіч сказаў жонцы:

— Анжэла, ведаеш, каго я запрасіў на вячэру? Архірэя памятаеш?

— Тэрэзінага?!

— Яго самага. Паглядзім, што ён за птушка. Няўжо і мы ў мастацтве ні фіга не разбіраемся... Ты асабліва не старайся, бульбы звары, ну, ікра там, пляшку "Марціні" пастаў... Што яшчэ?

Гудзевічыха ўсё ж пастаралася, нагатавала прысмакаў, кветак з аранжарэі нарэзала. Прычоску зрабіла, усе сукенкі перабрала, золата, каменьчыкі, якія былі, на сябе начапляла. Як жа — фатограф! Фотамастак! У Парыжы, ці дзе там, фотаздымак ацанілі. З фотаапаратам прыйдзе. Ды яшчэ той самы Архірэй, які ў бэзе з гувернанткай... Быў, словам! У Гудзевічыхі ажно замірала нешта пад рэбрамі. Як не верылася Тэрэзінай лухце — дзейнічала. А мо дзейнічалі ўласныя, дабаўленыя да Тэрэзіных фантазіі?!

З гэтага, уласна, і пачынаецца любоўная гісторыя. Менавіта з гэтага замірання пад сэрцам. Такі своеасаблівы гіпноз у прадчуванні нечага незвычайнага. Ды і якая жанчына ад суму і нудоты не хоча, не гатова закахацца? Асабліва калі муж шатайла добры, не адну палюбоўніцу мае. Ці не мае?! Хто яго ведае, дзе ён часам начуе, а потым апраўдваецца: "Бабкі, бабкі, бізнес..." "Бабы, а не бізнес", — казалі Гудзевічысе сяброўкі.

Вечарам муж скасавурыўся на прычоску, памацаў край сукенкі і папрасіў зняць золата, якім жонка абвешалася.

— Невядома, хто ён такі... Яшчэ, чаго добрага, зладзеяў навядзе...

Што зробіш, трэба падпарадкоўвацца.

4

Яна меркавала ўбачыць фотамастака з ліхаманкавым і адухоўленым позіркам. Спрактыкаваныя вочы ўміг раздзенуць яе, ацэняць і зноў адзенуць. Ад адной такой думкі яна аж лекацела, як кажуць у такіх момантах "шасціпальцыя". Яна прагла даведацца, якую ёй гэты чалавек, ацэншчык жаночай прыгажосці, паставіць адзнаку, як уздзейнічае на яго менавіта яе звабліваcць і прыгажосць. Ці патрэбна яна каму ў свае трыццаць два? Акрамя мужу-цягаку, зразумела...

Яна ўбачыла Архірэя на дарожцы, выбрукаванай бітымі кавалкамі мармуру, і крышачку скісла — ну, канечне, гэта быў той самы патлаты вахлак у каратканатых джынсах, якога бачыла ў мястэчку тысячу разоў. Адзін раз нават падышоў да яе, пэўна, нецвярозы, нешта мармытаў, а яна, каб адчапіўся, працягнула тысячу на піва, а ён хмыкнуў і падаўся прэч.

І на гэты раз ён быў у растаптаных чаравіках, у заношаным скураным пінжачку, але барада была расчэсана і кашуля з чыстым каўнерыкам.

"Не, — падумала Гудзевічыха, — цудаў на свеце не бывае. Дурасць — у яе гадах чакаць прынца. Яе прынц — Гудзевіч, валютчык, законны муж, за якім яна, як за жалезабетоннай сцяной. Яшчэ дачка расце... Кватэры, асабняк. Чаго рыпацца... Тэрэза — дурніца, ці мала што выдумала..."

Селі за стол. Пекінес Гудзевічыхі завалтузіўся ў яе на грудзях і перабраўся да Архірэя на калені. І гэта было дзіва, бо з рук не выпускала, а калі хацела каму пасадзіць сілай, сабачка гырчэў.

"Ён — добры, — падумала Анжэла. — Пінта да абы-каго на рукі не пойдзе. Але закахацца ў яго — барані Божа..."

Як напаследак, думка закахацца варухнула хвастом: ці не завесці якога іншага палюбоўніка, ад суму і ад нудоты крышку фліртануць? Хоць бы і з ім, Архірэем. І каб без складанасцей, не абцяжарваць сябе нічым, ніякімі лішнімі клопатамі, каб муж і не падазраваў нават.

У той бяседзе пілі шмат дарагога віна і па малюсенькай кропельцы каньяку, "віскаў" усялякіх. Урэшце, мяняла папрасіў зрабіць "нармальную фотку" жонкі.

— Як мадэлі ці як? — прамармытаў Архірэй. Ад вінаў і смачнай яды ён асалавеў. Пекінес на каленях спрабаваў злізаць ікру з надкушанага бутэрброда, які госць трымаў у руцэ.

— Не думай, што за так, — прамовіў валютчык. І памыліўся. Зрабіў няправільны ход. Бо Архірэй скрывіўся, адмоўна пахітаў галавой і адправіў у рот аблізаны сабачкам бутэрброд.

— Я без апарата.

Напраўду, Архірэй прыцёгся з голымі рукамі — у кішэні толькі зашмальцаваны часопіс, у трубку скручаны.

— У нас свой е! Во, самы лепшы...

— Не-е... — пакруціў галавой Архірэй, спадылба ўтаропіўшыся ў валютчыка. І выгляд у яго быў такі, што, маўляў, усіх тваіх грошай, валютная твая душа, не хопіць, маўляў, я — вольны! — не прадаюся, і шчоўкнуць тваю жонку не шчоўкну, бо я майстар, а не фатоаматар які з "мыльніцай".

— Як гэта не? Чаму? Ну колькі ты хочаш? За адзін шчаўчок? Дам, не пашкадую...

— Сто даляраў і бычка! — рагатнуў Архірэй. — Ды ці ведаеш, хто я?

— Дам і сто, — зацяўся валютчык. — Ведаю бо, хто ты...

Фатограф ухапіў бараду ў кулак, торгнуў яе і засмяяўся, чым паказаў белыя буйныя, як часнок, зубы.

— У цябе грошай не хопіць за адзін мой шчаўчок.

Працяг. Пачатак у № 47.

слухай сваё

НОВЫЯ ХІТЫ СТАРОГА АЛЬБОМА

"N.R.M.": "Тры чарапахі", Мн., 2002, MC і CD.

Зусім нядаўна ў інтэрв'ю нашай газеце ("ГР" № 41 за 9 кастрычніка 2002) лідэр культавага гурта "N.R.M." Лявон Вольскі, расказваючы пра новыя рэлізы калектыву (сінглы, альбомы, відэакліпы, канцэрты), згадаў і пра новую версію славутага альбома "Тры чарапахі". Дык вось гэты дыск ужо ў нашых руках.

Прызнацца, асабіста мяне задавальняла чорна-сіняя вокладка, якая ўпрыгожвала выданне фірмы "Bulba records"у 2000 годзе (нагадаю, што выданне было прызнана лепшым на "Рок-Каранацыі-2000"). Але не заўважыць і не звярнуць увагу на новы выпуск, здзейснены самімі музыкамі, было немагчыма. І не толькі зіхоткія чырвона-сіне-чорныя фарбы таму прычынай, а — для пачатку знаёмства — шыкоўны буклет з усімі тэкстамі песень альбома. І хоць у Лявона Вольскага зусім не кульгае дыкцыя, новае выданне нарэшце паставіла кропку ў доўгай маёй спрэчцы з адным сябрам, як гучыць прыпеў у песні "Бамжы"? Аказалася, у мяне са слыхам усё ў парадку:

Усё будзе так, як трэба нам!

Але вось сентэнцыю наконт "Які народ? Якая наша мова?", аказваецца, трэба чытаць крыху інакш.

Дый увогуле: тэксты Лявона Вольскага, як высвятляецца, цікава не толькі слухаць, але і проста чытаць. Якія змястоўныя сюжэты разгортваюцца ў вядомых ужо творах "Мы жывём някепска", "Мая ментальнасць", "Дзед Мароз", "Дастала"... Але не толькі новы буклет стаў для мяне асабіста прычынай замены першага выдання на другое. Істотныя сюрпрызы знойдзе слухач і ў самой праграме новага дыска.

Пачнём з таго, што гэта ўжо не звычайны кампакт-дыск (CD-digital-audio), а новы універсальны фармат для камп'ютэраў і музычных цэнтраў — CD-digital-audio +. І акурат на самым пачатку яго змешчаны грунтоўны мультымедыйны трэк, у якім уладальнік камп'ютэра знойдзе не толькі процьму каларытных фотаздымкаў улюбёнай каманды, але і відэакліп Анатоля Вечара да песні "Чыстая-светлая".

Дый audio-частка не засталася без змен, якія дацэняць аматары танцавальных дэнс-апрацовак славутых рок-мелодый. Гурту "N.R.M." у гэтым сэнсе надзвычай пашанцавала: DJ-міксы іх мелодый траплялі і ў беларускія выданні (гл. зборнік "Вольныя танцы: альтэрнатыва BY"), і ў замежныя (гл. кампіляцыю лепшых рэміксаў кампаніі "Coca-cola"). Вось і выдаўцы гэтага дыска вырашылі дабавіць у праграму пару такіх дзі-джэйскіх наватвораў, зробленых з самых папулярных песень альбома — "Катуй-ратуй" і "Катлет-матлет". Што да апошняга, дык варта зазначыць, які кардынальна новы твор зрабілі дзі-джэі новага пакалення. Ён не падобны нават на папулярную мінулагоднюю апрацоўку гэтай песні, зробленую дуэтам "Хоку" (Hobbit&Kukalka), які на пэўны час, на жаль, ад'ехаў у Ірландыю. Я нават не прадбачваў, што пад "Катуй-ратуй" можна танцаваць. Аказалася, яшчэ як можна: такі падкідальны рытм!

Звяртаючы ўвагу на прычыны, якія падштурхнулі музыкаў заняцца далейшым тыражаваннем сваёй прадукцыі самастойна, без звароту на якія-небудзь лейблы (аж занадта шмат нелегальных сініх "Трох чарапах" гуляе па свеце з-за недагляду або хлуслівасці "Bulba records"), лічу патрэбным паведаміць вытворчыя рэквізіты легальных дыскаў гэтай серыі: ifpi L-641, каталогавы нумар NG-2265.

Зрэшты, само малінавае ззянне вокладкі будзе сігналізаваць вам, што вы на правільным шляху пры выбары лепшага экземпляра для сваёй калекцыі. Дый знакі капірайта пазначаны ўжо новай датай — 2002.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА.

сямейны альбом

Нашы чытачы прызвычаіліся дзяліцца праз газету сваімі думкамі, уражаннямі. І калі ўлічыць, што "Голас Радзімы" трапляе да пастаянных чытачоў не адзін год запар, то яны ўжо маюць пэўнае ўяўленне адзін аб адным. І ўсё ж, каб больш прадметна расказаць пра сябе, запрашаем стварыць "Сямейны альбом".

Хацелася б, каб гэтая рубрыка па-мастацку злучыла самыя кранальныя і шчырыя імгненні жыцця беларускіх асяродкаў.

А сёння мы вернемся да мінчаніна Максімкі, першую вандроўку якога на лецішча адлюстраваў здымак у № 36 газеты за мінулы год. З таго часу Максімка падрос і ў яго з'явілася першае захапленне: хлопчык ўзяў у рукі пэндзаль.

Расці, Максімка, яшчэ пабачымся!..

занатоўкі з натуры

УСЕМАГУТНЫ ДОЛАР

Гарадскі хлопец даволі добра ўпісаўся на ўсё лета ў вёску. Яшчэ зусім малога бацькі прывозілі яго да бабулі і дзядулі. Той сябраваў з вясковымі дзецьмі, быў сярод іх як свой. Іншых бабулі нікуды ад сябе не адпускаюць, баяцца, каб не збеглі на рэчку, не звяліліся з крутога берага ў ваду. А гэты заўсёды босы, мурзаты, не адрозніш ад усіх.

І вось упершыню самастойна, на роўных з бацькам, ідуць на рыбалку. Недалёка ад ракі хлопец просіць бацьку закінуць вуды ў азярыну. Раней тут рыба была. А зараз мо з тыдзень трэба прасядзець, каб убачыць тую рыбіну. Закінулі, не прайшло і пяці хвілін, як паплавок малога знік пад вадой. Той спалохаўся, закрычаў і з усяе сілы пацягнуў на сябе. З вады выляцеў шчупак, у палёце перакусіў лёску і апынуўся на беразе ў траве.

Малюнак Вячаслава ІГНАЦЕНКІ.

На наступны год хлопчык злавіў добрага падлешчыка, не лічачы рознай рыбы-драбязы. Малы падрастаў, але год за годам кожным летам абавязкова выцягваў з вады нейкую рыбіну, якой мог пазайздросціць кожны рыбак. А аднойчы ён злавіў на вуду вялікага рака. Відаць, той быў стары. Яго тоўсты панцыр заімшэў, доўгія вусы хадзілі ва ўсе бакі, страшэнныя клюшні шукалі, каго схапіць, а вочы навыкат са здзіўленнем глядзелі на той сусвет, у які ён трапіў. Хлопчык не разгубіўся і адразу яго — у слоік з вадой. А той стаў яшчэ большы і страшнейшы. Жыве сабе рак за шклом, усе назіраюць за ім і яго паводзінамі.

Праз некалькі дзён прыязджае з горада цётка. Убачыла такі цуд і ледзь не загаласіла. Па гараскопе цётка была Рак, відаць, ёй шкада стала сапраўднага рака.

Давай выпусцім — і ўсё. А малому шкада: так цікава назіраць за членістаногім.

— А калі я ў цябе куплю рака?

Знайшоўся адзін долар, і пакупка здзейснілася.

І вось урачыста са слоікам усе ідуць на раку да таго месца, дзе злавілі рака, каб выпусціць яго на волю. Апынуўшыся ў рачной вадзе, рак нават адразу і не зразумеў, куды трапіў. Сядзіць на месцы і не рухаецца. Калі ж зразумеў, дзе апынуўся, хуценька паімчаўся ў тую цемру, адкуль так нечакана трапіў на белы свет.

Зараз хлопец падрос і стаў сапраўдным рыбаком. Рэдка пачалі здарацца нечаканасці на рацэ. Але прыгоды з ракам засталіся добрым успамінам для ўсіх. Першы камерцыйны поспех малога і зараз выклікае ўсмешку.

Ігнат СТУДЗЕНЬ.

крыжаванка ад любові іонавай



ПЕРАКЛАДЗІЦЕ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ. 1. Исповедь. 4. Список. 11. Закаливание. 12. Обновка. 14. Явь. 15. Безмолвие. 16. Галстук. 18. Стужа. 21. Поведение. 24. Селедка. 26. Сцена. 28. Сапожник. 30. Волк. 31. Толпа. 33. Табак. 35. Цвет. 37. Должность. 39. Отношение. 40. Слух. 41. Прощение.

ПА ВЕРТЫКАЛІ. 2. Вражда. 3. Недостаток. 5. Труд. 6. Отзывчивость. 7. Тмин. 8. Ботинок. 9. Бред. 10. Точность. 13. Корзина. 17. Дюжина. 19. Омлет. 20. Неделя. 22. Площадка. 23. Издевательство. 25. Захват. 27. Ощущение. 29. Стекло (в окне). 31. Совет. 32. Глазурь. 34. Читатель. 36. Лето. 37. Спесь. 38. Ожог.

«Голас Радзімы»
Галоўны рэдактар
Наталля САЛУК

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь;
Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь;
Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі;
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом «Радзіма».

Наш адрас: 220005, Рэспубліка Беларусь, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 44.
Тэлефоны: (+375-17) 288-11-97 (бухгалтэрыя, тэл./факс), 288-12-80, 284-76-56, 288-17-82.

ЧЫТАЙЦЕ «Голас Радзімы» Ў ІНТЭРНЭЦЕ:
http://golas.promedia.by

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», могуць не супадаць.

Рэгістрацыйнае пасведчанне №81. Падпісны індэкс у Беларусі 63854.
Тыраж 2 093 экз. Заказ 2716. Падпісана да друку 25. 11. 2002 г. у 12.00.

Газета набрана і звярстана на рэдакцыйным настольна-выдавецкім комплексе.

Аддрукавана ў друкарні «Беларускі Дом друку»
(220041, г. Мінск, пр. Скарыны, 77).